WSCHODNI ROCZNIK HUMANISTYCZNY
TOM XXI (2024), №1
s. 115-159
doi: 10.36121/dliseichykau.21.2024.1.115

Дзяніс Лісейчыкаў
ORCID 0009-0003-4151-0007
(Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, г. Вільнюс, Літва)

# „Книга глаголемая суботникъ". Памяннікі цэркваў і манастыроў *ritus graeci* Вялікага Княства Літоўскага XVII–XVIII стст.[1]

**Рэзюмэ**: Артыкул прысвечаны гісторыі ўзнікнення і бытавання ў Кіеўскай мітраполіі на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага адмысловых царкоўных кніг – *памяннікоў* альбо *суботнікаў*. Традыцыя вядзення адмысловых кніг для ўпісання імёнаў людзей, за спачын чыіх душаў трэба маліцца, ва Ўсходняй Царкве пачала афармляцца яшчэ ў X ст. З XIV–XV стст. функцыю захавання пасмяротнай памяці ад укладных запісаў у Евангеллях паступова перанялі адмысловыя памяннікі, якія вяліся пры многіх цэрквах *ritus graeci*. Аўтар падрабязна разглядае 15 захаваных і выяўленых памяннікоў цэркваў і манастыроў Вялікага Княства Літоўскага за перыяд XVII–XVIII стст., пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. У працы прадстаўлены падлікі інтэнсіўнасці складання памяннікоў у розных частках Кіеўскай мітраполіі, найбольш папулярныя назвы гэтых кніг, глыбіня іх памяці, паўната запаўнення, дадатковыя сюжэты. У якасці дадатка прыведзены каталог з падрабязным апісаннем выяўленых памяннікоў і асабовымі і геаграфічнымі паказальнікамі да іх.

**„Księga mówiona subotnik". Zabytki cerkwi i klasztorów *ritus graeci* w Wielkim Księstwie Litewskim w XVII–XVIII wieku**
**Streszczenie:** Artykuł przedstawia historię powstania i konteksty funkcjonowania ksiąg cerkiewnych – określanych terminem „pomianyków" lub „subotników" (sobotników) w unickiej metropolii kijowskiej na obszarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. Tradycja prowadzenia tych ksiąg, w których zapisywano nazwiska osób, w intencji dusz których

[1] Праца падрыхтавана ў рамках даследчага праекту „Bazylianie prowincji litewskiej w latach 1617–1839", які здзяйсняецца за кошт сродкаў Narodowe Centrum Nauki nr. UMO-2020/39/B/HS3/01232 (104/21/G). За дапамогу ў працы над артыкулам выказваю шчырую падзяку іярэю Расціславу Бандарэнку, Дзмітрыю Віцько, Яўгену Глінскаму, Раману Захарчанку, Іне Кажура, Марыі Карагодзінай, Юрыю Лаўрыку, Надзеі Марозавай, Марыне Скіданавай.

należy się modlić, ma swój początek w Kościele wschodnim już w X w. W XIV-XV w. funkcję utrwalania pamięci pośmiertnej z zapisów w księgach liturgicznych stopniowo przejmowały odrębne księgi pomianyków, które zakładano w wielu cerkwiach *ritus graeci*. Autor szczegółowo analizuje 15 zachowanych i odnalezionych zabytków piśmiennictwa cerkwi z klasztorów Wielkiego Księstwa Litewskiego z XVII–XVIII w., powstałych po zawarciu unii brzeskiej w 1596 r. W pracy zostały przedstawione analizy liczbowe na temat prowadzenia pomianyków w różnych częściach metropolii kijowskiej, najpopularniejsze tytuły tych ksiąg, głębia ich pamięci, zasób informacji oraz dodatkowe wątki. W załączniku znajduje się katalog zawierający spis zidentyfikowanych nazwisk oraz indeks osobowy i geograficzny.
**Słowa kluczowe**: metropolia kijowska, język ruski, kultura książki, memory studies, genealogia.

Мяжа XV–XVI стст. для Вялікага Княства Літоўскага была паводле трапнай фармуліроўкі Аляксандра Грушы перыядам „трыюмфу штучнай памяці"[2]. У XV–XVI стст. разам з развіццём пісьмовасці і актывізацыяй выкарыстання пісьмовых дакументаў у ВКЛ маёмасныя справы ўсё часцей заносіліся ў адмысловыя актавыя кнігі – гэта быў новы спосаб захавання і назапашвання інфармацыі. У развіцці дакументальнай пісьмовасці ВКЛ у XIV–XVI стст. апрача „памяці старыны" важную ролю адыгрывала таксама і „памяць па душы"[3]. У адной з ранейшых прац намі ўжо былі разгледжаны асаблівасці перадачы функцый захавання пасмяротнай памяці ў XV–XVI стст. ад роду (сям'і) да розных інстытутаў, у першую чаргу царкоўных[4]. Традыцыйна „памяць па душы" знаходзіла ўвасабленне ў малітвах за здароўе таго, хто ўнёс ахвяраванне на карысць храма, альбо за спачын яго душы. З XIII–XIV стст. ролю захавання „памяці па душы" выконвалі ўкладныя запісы ў Евангеллях[5]. Паводле тэрміналогіі, прапанаванай А. Грушам, гэта былі своеасаблівыя *протаакты*, якія мелі дзве асноўныя мэты – зафіксаваць факт перадачы маёмасці царкве і захаваць пасмяротную памяць па асобе дарыцеля („по души своеи", „на памят души своей и родителем моим", „абы за души предковъ его и за его самого Бога милоч прошено" і інш.)[6]. Акурат у гэты ж час здабываюць папулярнасць і адмысловыя віды царкоўных кніг, прызначаных выключна для захавання „памяці па душы", *сінодзікі* альбо *памяннікі* – напрыклад, Слуцкі, Кіева-Пячэрскі, Гарадзішчанскі[7], якія паступова выцеснілі ўкладныя запісы ў Евангеллях. Першапачаткова пад запазычанай з грэцкай мовы назвай

[2] А.И. Груша, *Документальная письменность Великого Княжества Литовского (конец XIV – первая треть XVI в.)*, Минск 2015, s. 260.

[3] Tamże, s. 84.

[4] Д.В. Лісейчыкаў, *«Ходилъ до церкви и тамъ надгробокъ писаныи виделъ…»: кірылічныя надмагіллі XVI–XVII стст. на землях Вялікага Княства Літоўскага w: EPITAPHIUM: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зборнік артыкулаў,* склад. С.У. Грунтоў, Д.В. Лісейчыкаў, Мінск 2022, s. 69–101.

[5] А. Груша, *Вкладные записи XIV в. в книгах Евангелия: акты или протоакты w: Русский Книжник*, ред. А.В. Кузьмин, Москва 2015, s. 33.

[6] Tamże, s. 37–38.

[7] Р. Пятраўскас, *Літоўская знаць у канцы XIV–XV ст.: склад – структура – улада*, пер. Алесь Мікус, Смаленск 2014, s. 139.

*Сінодзік* фігуравала канкрэтная царкоўная служба „Чын праваслаўя", складзеная ў 843 г. у гонар перамогі над іконаборцамі. У гэтай службе асобна вылучаўся спіс „для вечнай памяці", які пастаянна дапаўняўся і ў XV–XVI стст. часта перавышаў па аб'ёме саму службу[8]. У рэшце рэшт, *сінодзікі* альбо *памяннікі* сталі асобным відам царкоўных кніг.

Практыку і інтэнсіўнасць вядзення памяннікоў у Кіеўскай мітраполіі на тэрыторыі ВКЛ у пачатку XVI ст. можна ўбачыць на прыкладзе захавання пасмяротнай памяці па кіеўскім ваяводзе Дзмітрыі Пуцяцічы, памерлым у 1505 г. Ягоным душапрыказчыкам выступіў князь Міхал Глінскі, які загадаў упісаць імя памерлага і яго ахвяраванні ў сінодзік кіеўскіх мітрапалітаў, сінодзікі епархій – смаленскі, полацкі, уладзімірскі, луцкі, тураўскі, перамышльскі і холмскі, а таксама ў сінодзікі 39 розных цэркваў і манастыроў: у Брэсце, Вільні, Віцебску, Гродне, Жыдзічыне, Луцку, Любліне, Навагрудку, Мінску, Перамышлі, Полацку, Смаленску, Супраслі, Холме і некаторых цэрквах на землях памерлага ваяводы[9]. Як бачым, на той час вядзенне памяннікоў было ўжо паўсюднай практыкай. Памяннікі саборнай царквы Успення Багародзіцы ў г. Вільні і манастыра Св. Барыса і Глеба ў г. Полацку, верагодна, канца XV – пач. XVI ст. апісаў у сваёй працы В. Ластоўскі, прычым апошні з іх даследчык бачыў на ўласныя вочы яшчэ ў 1910-х гг.[10]

Тастаменты шляхты і мяшчан ВКЛ другой паловы XVI ст. толькі ўскосна ўзгадваюць неабходнасць пасмяротнага памінання імёнаў тастатараў: „а на Троицу десеть копъ грошеи и за то мают поминать"[11] (жонка троцкага канюшага Філія Валовіч, 1567 г.), „напервеи душу мою поминати, паметь слушне чинити"[12] (слонімскі мешчанін Фёдар Укаловіч, 1575 г.), „на упоминки водлуг звычаю старого, водлуг костела греческого, отписал двадцат пят коп грошеи"[13] (магілёўскі купец Аверка Процкавіч, 1580 г.), „поминки чынит водлуг обраду и церомонии закону костела греческого"[14] (магілёўскі мешчанін Грышка Іванавіч, 1588 г.) Паколькі ў тастаментах прапісвалася, што памінанне будзе адбывацца пры канкрэтных цэрквах, само сабой мелася на ўвазе, што імёны будуць упісаныя ў памяннікі гэтых цэркваў. У тастаментах XVII ст. гэта акрэслівалася выразней: „Пры гэтым каб і імя нябожчыка ў памяннік наш брацкі ўпісалі, каб на вечныя часы пры адпраўленні за нашу памерлую брацію задушных Божых службаў і за яго ахвяра Богу, у Святой Тройцы адзінаму, была прынесена"[15] (сын віленскага мешчаніна Змітра Бражыца Васіль, 1649 г.).

[8] Е.В. Петухов, *Очерки из литературной истории Синодика*, Санкт-Петербург 1895, s. II–VI.

[9] А. Груша, *Вкладные записи…*, s. 40–42.

[10] В. Ластоўскі, *Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя*, Коўна 1926, s. 487.

[11] *Актавая кніга Гродзенскага земскага суда*. 1568–1570 гг., Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (dalej: НГАБ), ф. 1755, воп. 1, нр 4. k. 254.

[12] *Актавая кніга Слонімскага гродскага суда*. 1574–1578 гг., НГАБ, ф. 1737, воп. 1, нр 2, k. 193v.

[13] *Актавая кніга Магілёўскага магістрата*. 1580–1581 гг., НГАБ, ф. 1817, воп. 1, нр 2, k. 67.

[14] *Актавая кніга Магілёўскага магістрата*. 1587–1588 гг., НГАБ, ф. 1817, воп. 1, нр 3, k. 516.

[15] *Wilnianie. Żywoty siedemnastowieczne*, wyd. D. Frick, Warszawa 2008, s. 129.

У дадзенай працы мы не будзем падрабязна спыняцца на асаблівасцях складання памяннікоў цэркваў і манастыроў Кіеўскай мітраполіі на тэрыторыі ВКЛ ранняга перыяду, канца XV–XVI стст., якія даволі добра разгледжаны ў адмысловай літаратуры[16]. Увага будзе засяроджана на бытаванні гэтага віду царкоўнай дакументацыі ў Кіеўскай мітраполіі на тэрыторыі ВКЛ пасля заключэння Брэсцкай уніі 1596 г. Дадатковая мэта працы – ўвядзенне ў навуковы ўжытак малавядомых і невядомых помнікаў царкоўнага справаводства з першаснай распрацоўкай: складаннем асабовага і геаграфічнага паказальнікаў да зместа іх запісаў. У архівах, бібліятэках і музеях Беларусі, Літвы і Украіны намі было выяўлена 15 памяннікоў цэркваў *ritus graeci* ВКЛ XVII–XVIII стст. (уніяцкіх і праваслаўных). Каб не памнажаць колькасць спасылак і адсылак у тэксце, пры цытаванні зместа выяўленных памяннікоў будуць выкарыстоўвацца назвы населеных пунктаў, у якіх яны былі створаны, і пазначэнні канфесійнай прыналежнасці (ун. – уніяцкі, пр. – праваслаўны) у наступным выглядзе: **Велікарыта [ун.], Грозава [пр.], Данілавічы [ун.], Дзісна [пр.]. Дзятлавічы [пр.], Дукора [ун.], Жыровічы [ун.], Зубачы [ун.], Пeравалока [ун.], Слуцк, Св. Канстанціна і Алены [пр.], Слуцк, Св. Тройцы XVII [пр.], Слуцк, Св. Тройцы XVIII [пр.], Смалявічы [ун.], Супрасль [ун.], Узда [ун.]**. Іх апісанне, архіўныя, бібліятэчныя і музейныя шыфры ў алфавітным парадку прыведзены ў канцы гэтага артыкула.

Для пачатку неабходна высветліць – наколькі традыцыя складання памяннікоў заставалася распаўсюджанай для XVII–XVIII стст.? Вядома, што памяннікі вяліся далёка не ў кожнай парафіі. Устанавіць колькасць цэркваў, пры якіх вяліся памяннікі, задача няпростая. Такія масавыя і падрабязныя крыніцы царкоўнага паходжання як *візіты* (пратаколы генеральных візітацый) у большасці выпадкаў наяўнасць памяннікоў не фіксуюць. Напрыклад, цалкам адсутнічаюць згадкі пра памяннікі ў візітах цэркваў Гродзенскага, Мінскага і Навагрудскага афіцыялатаў Кіеўска-Віленскай мітрапаліцкай епархіі 1680–1697 гг., Полацкай пратапопіі 1684 г., а таксама цэркваў Полацкай архіепархіі 1703 г.[17] Пры тым, што наяўнасць метрычных і літургічных кніг у гэтых дакументах адзначалася. Затое наяўнасць памяннікоў была адлюстравана ў грунтоўных генеральных візітацыях цэркваў Уладзімірскага афіцыялату 1695 г. і Брэсцкага афіцыялату 1725–1727 гг. Уладзімірска-Брэсцкай епархіі. Да Брэсцкага афіцыялату гэтай епархіі адносіліся цэрквы на тэрыторыі ВКЛ

[16] С.Т. Голубев, *Древний помянник Киево-Печерской лавры (конца XV и начала XVI ст.)*, w: *Чтения в Историческом обществе Нестора летописца*, кн. 6, отд. 3, Киев 1892, s. 1–88; М. Нікалаеў, *Палата кнігапісная: рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях*, Мінск 1993 (гл. раздзел „Паменнікі альбо сінодыкі", s. 75–88); Р.В. Зотов, *О черниговских князьях по Любецкому синодику и о Черниговском княжестве в татарское время*, Санкт-Петербург 1892; *Поменник Введенської церкви в Ближніх печерах Києво-Печерської лаври. Публікація рукописної пам'ятки другої половини XVII ст.*, упоряд. О. Кузьмук, Київ 2007.

[17] *Отчеты о визитации униатских церквей с подробным описанием их состояния*. 1703 г., Российский государственный исторический архив (dalej: РГИА), ф. 823, оп. 3, нр 455; *Уніяцкія цэрквы Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.: матэрыялы генеральных візітацый*, уклад. Д. В. Лісейчыкаў, Мінск 2021.

і Падляшскага ваяводства Каралеўства Польскага, цэрквы Уладзімірскага афіцыялату знаходзіліся цалкам на тэрыторыі Каралеўства Польскага (назавём гэтыя часткі умоўна „Літоўскай" і „Кароннай"). Дадзеныя аб інтэнсіўнасці вядзення памяннікоў у абедзвюх частках епархіі адрозніваюцца вельмі істотна (гл. Табліцы 1 і 2).

Табліца 1. Наяўнасць памяннікоў пры цэрквах Брэсцкага афіцыялату Уладзімірска-Брэсцкай уніяцкай епархіі. 1725–1727 гг.[18]

| Дэканат | Колькасць цэркваў | Колькасць памяннікоў | % |
|---|---|---|---|
| Бельскі (г. Бельск) | 26 | 0 | 0 |
| Бельскі (м. Белая) | 26 | 6 | 23,1 |
| Брэсцкі | 45 | 6 | 13,3 |
| Драгічынскі | 24 | 1 | 4,2 |
| Камянецкі | 36 | 3 | 8,3 |
| Кобрынскі | 12 | 6 | 50 |
| Мельніцкі | 24 | 1 | 4,2 |
| Палескі | 20 | 0 | 0 |
| Пружанскі | 19 | 2 | 10,5 |
| Уладаўскі | 20 | 2 | 10 |
| УСЯГО: | 252 | 27 | 10,7 |

Табліца 2. Наяўнасць памяннікоў пры цэрквах Уладзімірскага афіцыялату Уладзімірска-Брэсцкай уніяцкай епархіі. 1695 г.[19]

| Дэканат | Колькасць цэркваў | Колькасць памяннікоў | % |
|---|---|---|---|
| Камень-Кашырскі | 19 | 6 | 31,6 |
| Кіселінскі | 9 | 3 | 33,3 |
| Ковельскі | 33 | 25 | 75,8 |
| Порыцкі | 11 | 8 | 72,7 |
| Сакальскі | 16 | 6 | 37,5 |
| Тартакоўскі | 10 | 5 | 50 |
| Тарчынскі | 29 | 11 | 37,9 |
| Уладзімірскі | 52 | 41 | 78,8 |
| УСЯГО: | 179 | 105 | 58,7 |

[18] Падлікі аўтара паводле: *Protokóły wizytacyjne i wizytacja generalna cerkwi w diecezji chełmskiej, bełskiej i brzeskiej*. 1720–1721, 1725–1727, Archiwum Państwowe w Lublinie (dalej: APL), Chełmski Konsystorz Greckokatolicki, sygn. 101.

[19] Падлікі аўтара паводле: *Генеральні візитації церков і монастирів Володимирської унійної епархії кінця XVII – початку XVIII століть: книга протоколів та окремі описи*, ред. А. Ґіль, І. Скочиляс, Львів–Люблін 2012.

Паколькі дакладныя падлікі па іншых епархіях правесці немагчыма, у якасці эталона інтэнсіўнасці складання памяннікоў пры цэрквах *ritus graeci* ВКЛ у XVII–XVIII стст. возьмем дадзеныя па Брэсцкім афіцыялаце. На яго тэрыторыі ў 1725–1727 гг. налічвалася 252 царквы. Памяннікі меліся пры 27 цэрквах альбо пры 10,7 % ад агульнай колькасці. Прасцей кажучы, яны вяліся пры кожнай дзясятай царкве. На „Каронных" землях Кіеўскай уніяцкай мітраполіі сітуацыя выглядае карэнным чынам інакш – памяннікі пры цэрквах тут вяліся ў шэсць разоў інтэнсіўней. Гэтым можна патлумачыць і даволі малую колькасць захаваных да нашага часу памяннікоў з цэркваў і манастыроў „Літоўскай" часткі мітраполіі. Аднак дакладнасць нават такіх падлікаў можа быць прыблізнай. Цалкам захаваны да нашага часу памяннік царквы ў м. Зубачы Брэсцкага павета[20], які пачаў весціся з 1683 г., у пратаколах візітацыі 1725–1727 гг. не адзначаны. Магчыма, гэты памяннік у час візітацыі знаходзіўся ў бібліятэцы суседняй царквы ў в. Полаўцы Брэсцкага павета, дзе быў зафіксаваны „суботнік in 4to"[21].

У візітах цэркваў Уладзімірска-Брэсцкай епархіі 1695–1727 гг. сустракаюцца дзве найбольш распаўсюджаныя назвы кнігі: *памяннік (pominnik)* і *суботнік (subotnik, sobotnik)*. Прычым, папулярнасць гэтых двух варыянтаў у дзвюх частках епархіі істотна адрознівалася. У візітах цэркваў „Літоўскай" часткі яны называліся выключна *суботнікамі*. У візітах цэркваў „Кароннай" налічваецца 128 узгадак гэтага віду дакументацыі, 114 разоў яны названы *памяннікамі*, 14 – *суботнікамі*. Хоць колькасць згадак варыянта *суботнік* не надта вялікая, а таму не зусім рэпрэзентатыўная, цікава, што палова гэтых згадак прыпадае на цэрквы Камень-Кашырскага і Ковельскага дэканатаў, самых паўночных тэрыторый, якія знаходзіліся бліжэй за ўсё да ВКЛ. Такім чынам, можна сцвярджаць, што на землях ВКЛ быў больш распаўсюджаны тэрмін *суботнік*, а на землях Каралеўства Польскага – *памяннік*. Цікава, што з 9 выяўленых памяннікоў уніяцкіх цэркваў ВКЛ XVII–XVIII стст., у 5 саманазва *суботнік* (**Данілавічы [ун.]**, **Дукора [ун.]**, **Пераралока [ун.]**, **Смалявічы [ун.]**, **Узда [ун.]**), 1 не ўтрымлівае ніякай назвы (**Велікарыта [ун.]**), 2 утрымліваюць абедзве назвы, і *суботнік*, і *памяннік* (**Зубачы [ун.]**, **Супрасль [ун.]**), 1 называецца толькі *памяннікам* (**Жыровічы [ун.]**) Гэта тое, што тычыцца ўніяцкіх цэркваў. З памяннікамі праваслаўных цэркваў і манастыроў сітуацыя адрозніваецца яшчэ мацней. З 6 выяўленых памяннікоў (самыя раннія запісы ў іх датуюцца 1720–1740-мі гг.) ніводзін не мае саманазвы *суботнік*. 4 называюцца *сінодзікам* (**Дзісна [пр.]**, **Дзятлавічы [пр.]**, **Слуцк Св. Канстанціна і Алены [пр.]**, **Слуцк Св. Тройцы XVIII [пр.]**), 1 называецца *памяннікам* (**Слуцк Св. Тройцы XVII [пр.]**) 1 не ўтрымлівае ніякай назвы (**Грозава [пр.]**). Аднак, напрыклад, калі грозаўскі праваслаўны ігумен уносіў у царкоўнаславянскі тэкст польскамоўны запіс аб ахвяраванні на царкву ад імя капыльскіх мяшчанаў Вайцяховічаў,

20 *Памяннік царквы ў м. Зубачы Брэсцкага павета*, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (dalej: НГМРБ), кп 466.

21 *Protokóły wizytacyjne i wizytacja generalna…*, s. 166.

то назваў кнігу (у польскамоўнай пазнацы) *суботнікам*[22]. Відавочна, што традыцыя праваслаўнай часткі Кіеўскай мітраполіі, прынамсі ў XVIII ст., больш апелявала да згаданай службы „чына праваслаўя" з яе *сінодзікам*. Тэрміны *памяннік* і *дыптых* выкарысталі для свайго збору жыццяпісаў манахаў-базыльян першай чвэрці XVIII ст. Ян Аляшэўскі, Філарэт Шукевіч і Антон Завадскі, якія займалі розныя высокія пасады ў базыльянскім ордэне: „Dypticłi Abo Pominnik wyrażający smiertelności ludzkiey obraz"[23]. Аднак і паводле жанру, і паводле прызначэння гэта абсалютна іншая кніга, якая па-сутнасці ўяўляла сабой помнік жыційнай літаратуры. Гэтыя базыльянскія памяннікі-жыціі мы разглядаць не будзем, хоць, напрыклад, М. Нікалаеў адносіць гэтыя творы да ліку памяннікоў новага тыпу[24]. Паколькі мы разглядаем памяннікі, якія складаліся пры канкрэтных храмах, у поле нашай увагі не патрапіць і своеасаблівы родавы памяннік князёў Сангушкаў канца XV ст., які, дарэчы мае саманазву *суботнік*[25].

Тэрмін *суботнік* з'явіўся і замацаваўся за памяннікамі з-за таго, што зачытванне імёнаў упісаных асобаў адбывалася, як правіла, у адмысловыя памінальныя суботы на працягу ўсяго году. Адзін з самых ранніх выпадкаў ужывання гэтага тэрміну на тэрыторыі ВКЛ сустракаецца ў дакуменце ад 9 кастрычніка 1406 г. У гэты час Баярын Грыдзька Дружылавіч прасіў полацкага епіскапа Феадосія „штобы мене жаловалъ и вписалъ мене и сына моего у суботникъ со отцомъ моимъ по роду"[26]. Баярын меў на ўвазе, відавочна, епархіяльны полацкі памяннік. Пінскі князь Фёдар Яраславіч у 1502 г. пішучы пра клір царквы Св. Дзмітрыя ў г. Пінску, адзначаў:

> „А тые попы и дьяконъ маютъ рано и въ вечоръ на литеяхъ помниати души родичей нашыхъ и слугъ нашыхъ, которые есть вписаны въ суботнику"[27].

Вялікі літоўскі гетман Рыгор Хадкевіч у 1563 г. пры наданні фундуша на царкву ў м. Заблудаў вызначаў памер аплаты, які мусіць браць клір за розныя віды паслугаў, і сярод іх „отъ упису в суботникъ грошей дванадцать"[28]. Як можна

[22] *Памяннік манастыра ў м. Грозава Навагрудскага павета*, НГМРБ, кп 444, k. 17v.

[23] *Kathalog zmarłych osob w zakonie. XVIII в.*, Санкт-Петербургский институт истории Российской академии наук (dalej: СПбИИ РАН), архив, ф. 52, оп. 1, нр 324; *Dyptichi Abo Pominnik. XVIII в.*, СПбИИ РАН, архив, ф. 52, оп. 1, нр 363; *Поминникъ. XVIII в.* Российская Национальная Библиотека, отдел рукописей, польск. F. I. № 47.

[24] М. Нікалаеў, *Палата кнігапісная…*, s. 80, 83, 87.

[25] *Субботникъ или помянникъ рода Сангушковъ [Sanguškų giminės sinodikas, t.y. vardų sąrašas, sudarytas jų paminėjimui mišių metu]*, Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka (dalej: LMAVB), f. 19, nr 70 (Апісанне памяннікоў такога тыпу гл.: Нікалаеў М., *Палата кнігапісная…*, s. 76, 79).

[26] *Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при управлении Виленскаго учебнаго округа*, т. 1, Вильна 1867, s. 1.

[27] *Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли*, Вильна 1867, s. 322–323.

[28] *Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов*, т. 11: *Акты Главнаго Литовскаго Трибунала*, Вильна 1880, s. 38.

ўбачыць, тэрмін *суботнік* бытаваў у Кіеўскай мітраполіі яшчэ да падзелу яе на ўніяцкую і праваслаўную часткі. Традыцыя выкарыстання гэтай назвы прадоўжылася і ў той частцы мітраполіі, якая пасля 1596 г. прыняла Брэсцкую ўнію. У адноўленых у 1620-х гг. структурах Кіеўскай праваслаўнай мітраполіі (прынамсі на тэрыторыі яе „Літоўскай" часткі) вярнуліся да архаічнай назвы дакумента – *сінодзік*. Менавіта *сінодзікам* называецца, напрыклад, складзены ў 1684 г. і незахаваны да нашага часу памяннік праваслаўнай саборнай царквы Успення Багародзіцы ў г. Слуцку[29].

У царкоўным справаводстве памяннікі доўгі час выконвалі ролю метрычных кніг аб памерлых. Прычым стаўленне ва ўніяцкай і неўніяцкай частках Кіеўскай мітраполіі XVII–XVIII стст. да гэтай іх функцыі адрознівалася. Трэбнік кіеўскага праваслаўнага мітрапаліта Пятра Магілы 1646 г. прадугледжваў вядзенне пры цэрквах чатырох тыпаў метрычных кніг – хрышчэнняў, шлюбаў, памерлых і спіса жывых парафіян[30]. Такім чынам, Праваслаўная царква ўжо ў той час размяжоўвала функцыі метрык аб памерлых з функцыямі памяннікоў. Першы ж заканадаўчы акт, які рэгуляваў вядзенне метрычных кніг ва Уніяцкай царкве, быў прыняты ў 1667 г. на 17-й кангрэгацыі базыльянскага ордэна ў г. Вільні. На ёй была выдадзена пастанова аб абавязковай наяўнасці пры кожным манастыры толькі „метрык хрышчэнняў і шлюбаў"[31]. Пры правядзенні генеральнай візітацыі цэркваў „Літоўскай" часткі Кіеўскай уніяцкай мітраполіі ў 1680–1682 гг.[32] адмысловым пунктам правяралася наяўнасць пры храмах метрык гэтых двух відаў, як і агаворвала пастанова ад 1667 г. Катэхізіс кіеўскага ўніяцкага мітрапаліта Л. Кішкі 1722 г. „Собраніе припадковъ краткое…" таксама загадваў святарам асобнымі кнігамі весці толькі натаванне хрышчэнняў і шлюбаў[33].

Як вынік, згадкі памяннікоў ва ўніяцкіх візітацыях амаль заўсёды ішлі ў звязцы з узгадкай пра метрыкі, часам наўпрост – „метрыка з памянніком заадно"[34]. Да такіх своеасаблівых „канвалютаў" адносяцца і выяўленыя *метрыкі-памяннікі* цэркваў у м. Узда[35] і в. Данілавічы[36] Мінскага павета. Да

[29] В. Ластоўскі, *Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі…*, s. 488.

[30] *Евхологіонъ албо Молитвословъ или Требникъ. Имеяи в себе церковная различная последованія іерєомъ подобающая*, Київ 1646, s. 425–430.

[31] *Археографический сборник документов, относящихся к истории Северозападной Руси, издаваемый при управлении Виленскаго учебнаго округа*, т. 12, Вильна 1900, s. 100.

[32] *Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: зборнік дакументаў*, уклад. Д.В. Лісейчыкаў, Мінск 2009.

[33] *Собраніе припадковъ краткое, и духовнымъ особомъ потребное. Имущее в себе Nауку о Сакраментахъ, о десяти Божїихъ Приказаняхъ, о Приказаняхъ Церковныхъ, и о Nауце Христїанской, съ выкладомъ Символа или Исповеданїя Веры Православныя Кафолическїя, съ выкладомъ Молитвы: Отче нашъ: и Богородице Дево: Такожде Nауку, како подобаетъ наставляти малыхъ или невежовъ в Веры Православной, содержащее*, Супрасль 1722, s. 14, 81.

[34] *Генеральні візитації церков і монастирів Володимирскої унійної епархії…*, s. 20.

[35] *Метрычныя кнігі аб народжаных царквы ў м. Узда Мінскага павета. 1724–1738 гг.*, НГАБ, ф. 136, воп. 13, нр 1064, k. 49–53v.

[36] *Метрычныя кнігі аб памерлых царквы ў в. Юравічы Мінскага павета. 1759–1795 гг.*, НГАБ, ф. 136, воп. 13, нр 1098, k. 7v–9v.

цікавых эпітэтаў, якія сустракаюцца пры апісанні памяннікоў у візітах, можна аднесці: „метрыка мала што пісаная, такі ж і памяннік”, „метрыкі толькі пачатак і памянніка”, „памяннік сякі-такі”, „метрыкі і памянніка толькі асобныя нататкі”, „памяннік які-ніякі быў агледжаны”, „памяннік прыстойны”, „метрыкі толькі знак і памянніка таксама”, „суботніка толькі пачатак”[37]. З апісання ў візітах можна зразумець, што памяннікі (як і метрычныя кнігі) захоўваліся асобна ад астатняй царкоўнай бібліятэкі і архіва. Найверагодней, іх трымалі ў алтары, на ахвярніку: „Ахвярнік здавальняюча накрыты, на якім толькі копійка, і метрыка, і памяннік”[38].

Усе выяўленыя памяннікі складзены на сумесі царкоўнаславянскай і „рускай” моваў. У гэтым палягае іх прынцыповае адрозненне ад метрычных кніг, якія ў XVIII ст. альбо ўжо цалкам вяліся па-польску, альбо перайшлі на польскую да канца існавання Рэчы Паспалітай[39]. Чаму так адбылося, можна зразумець, калі выкарыстаць да абодвух відаў царкоўнай дакументацыі класіфікацыю, прапанаваную С. Цямчыным[40]. Ён падзяляе царкоўныя тэксты паводле спалучэння прыкмет „адрасат–паходжанне”, дзе ў якасці асноўнай катэгорыі выступае адрасат (для каго быў прызначаны тэкст?) Згодна з гэтай класіфікацыяй усе тэксты дзеляцца на тры групы: „ад Бога да чалавека”, „ад чалавека да Бога” і „ад чалавека да чалавека”. Метрычныя кнігі адпавядаюць групе „ад чалавека да чалавека”, а вось памяннікі адносяцца да групы „ад чалавека да Бога”. У дакументах, адрасатам якіх выступае Бог, мова кансервуецца і амаль не мяняецца, калі ж адрасатам з’яўляецца чалавек (метрычныя кнігі), то мова змяняецца адпаведна з навыкамі і густамі складальніка. У памянніку Слуцкага праваслаўнага манстыра Св. Тройцы 1630-х гг. некаторыя малітвы былі занатаваны таксама на грэцкай мове, а асобныя словы нават па-яўрэйску[41].

Па-царкоўнаславянску, як правіла, занатоўвалася сама памінальная формула, а таксама прадмовы ў найбольш разгорнутых памянніках, у першую чаргу – манастырскіх. Да „рускамоўнай” часткі можна аднесці фрагменты тэкстаў з тлумачэннямі прычын смерці, месца пахавання, прычын унясення асоб у кнігу, а таксама амаль заўсёды формы натавання імёнаў уласных у памянніках сельскіх цэркваў, якія падаваліся ў простанародным варыянце: *Авдоця, Агапа, Алеся, Амелян, Арына, Барбара, Василь, Гаврыла, Ганна, Грипина, Евга, Іесип, Катарына, Кирык, Крыся, Малания, Малахвей, Матруна, Микита, Миколай, Михал, Палута, Параска, Пилип, Прокоп, Сидор, Стась (Стаська), Сымон,*

---

[37] *Генеральні візитації церков і монастирів Володимирскої унійної епархії…*, s. 28, 41, 66, 88, 129, 136, 183, 198, 215.

[38] Tamże, s. 60.

[39] Д. Лісейчыкаў, *«Азъ, іерей...»: «руская» мова метрычных кніг уніяцкіх цэркваў Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII стагоддзях, „Київська Академія”*, вып. 13, 2016, s. 109–172.

[40] С.Ю. Темчин, *Функционирование руськой мовы и иерархия церковных текстов*, „Studia Russica”, t. 23, 2009, s. 227–228.

[41] Н.А. Кобяк, Н.А. Морозова, А.А. Турилов, *Кириллические рукописные книги XV–XIX вв. в собраниях фондов 21 и 22 БАН Литвы*, „Krakowsko-Wileńskie Studia Slawistyczne”, t. 2, 1997, s. 62.

*Таціана, Терешка (Церешка), Трахим (Атрахим), Тося, Хадора, Халимон, Хведор, Хвеся, Хима, Ховра, Цимох, Цихан, Юстына, Явхим, Яким, Якуб, Ярош, Яцка* і інш.

Фіксацыя імёнаў і прозвішчаў мела і свае рэгіянальныя асаблівасці. Напрыклад, у даволі поўным памянніку ўніяцкай царквы ў м. Узда Мінскага павету за 1716–1777 гг. практычна адсутнічаюць прозвішчы тых, чые душы належыць памінаць. У памянніку ўніяцкай царквы ў в. Пералалока Слонімскага павета 1663–1838 гг. часта фіксавалася архаічнае імя *Ждан*. Святары маглі адзначаць не толькі прозвішчы, але і сельскія мянушкі некаторых мясцовых родаў. Так, напрыклад, розныя галіны рода з прозвішчам Мазоўка, мелі мянушкі *Батура, Шашаль* альбо *Яўсеяўчык*, Калбека – *Страх*, Палуян – *Свістун*, Маркевіч – *Шчэрба*, Скарабагаты – *Засулька*, Мельнік – *Шкарапа* і *Дзіравы*, Таўкач – *Курдупель* (**Дукора [ун.]**). Асобныя сем'і разгалінаванага роду Савічаў былі дадаткова адзначаны мянушкай *Буры*, род Рамана Нараговіча – *Карасік* (**Пералалока [ун.]**). У некаторых выпадках святар ленаваўся ўносіць у кнігу дакладныя імёны тых, каго трэба памінаць: „ты сам, Господи, имена ихъ веси" (**Пералалока [ун.]**) Часам памяннікі фіксавалі замену аднаго прозвішча на іншае, што практыкавалася ў сялянскім асяроддзі: „1838 miesiąca oktombra wpisano w sobotnik Daniłowiczów z tem, żeby 31 oktombra była prawiona w familii Daniłowiczów zwane Pietrukowiczami" (**Пералалока [ун.]**). Паколькі падобныя упісанні-тлумачэнні адрасаваліся не Богу, а чалавеку (паводле класіфікацыі С. Цямчына), то ў іх магла выкарыстоўвацца побытавая польская мова. На польскай мове запісаныя і пазнейшыя тлумачэнні да асноўнага зместа памянніка ўніяцкага Жыровіцкага манастыра[42].

У памянніках уніяцкіх цэркваў у другой палове XVIII ст. часта адбываўся пераход з кірылічнай на лацінскую графіку, пры гэтым пераход на польскую мову ў адрозненне ад метрычных кніг не адбываўся – па-ранейшаму захоўвалася царкоўнаславянская і „руская" лексіка. Паколькі запісы, як правіла, не былі датаванымі, вельмі цяжка устанавіць дакладны час такога пераходу. Яго ўдалося прасачыць толькі на прыкладзе царквы ў в. Пералалока Слонімскага павету, дзе маецца даволі істотная колькасць датаваных нататак. Дзевяць дакладна датаваных інскрыпцый размеркаваны наступным чынам: 1663, 1720, 1723 гг. – кірыліца, 1744, 1756, 1766, 1813, 1817, 1833 гг. – лацінка. Такім чынам, пераход на лацінскую графіку адбыўся паміж 1723 і 1744 гадамі. Верагодна, падобная сітуацыя была і з іншымі ўніяцкімі памяннікамі. Праваслаўныя памяннікі практычна цалкам вяліся на кірыліцы, выкарыстоўваючы лацінскую графіку (і нават польскую мову) хіба ў нестандартных сітуацыях. Напрыклад, у цалкам кірылічным памянніку праваслаўнага манастыра ў в. Дзятлавічы Навагрудскага павета прозвішча манаха Феадосія Плебановіча было занатавана лацінкай – *Plebanowicz*. Магчыма, таму, што аўтар асацыяваў прозвішча з запазычаным з лацінскай мовы праз польскую тэрмінам *плябанія* – назвай жылых і гаспадарчых пабудоў у рымска- і грэка-каталіцкіх святароў.

[42] Ф.Н. Добрянский, *Описание рукописей Виленской публичной библиотеки, церковно-славянских и русских*, Вильна 1882, s. 189–191.

Формулы ўпісання асобаў у памяннік былі стандартнымі з невялікімі варыяцыямі: „Помяни, Господи, рабовъ своихъ…”, „За упокой…”, „За усопшихъ…”, „Поминание…” (**Грозава [пр.])** „Помяни, Господи, во блаженной памяти преставлшихся…” (**Дзісна [пр.]**); „Помяни, Господи, душу рабы твоея…”, „Помяни, Господи, рабовъ своихъ…”, „Помяни, Господи, души усопшыхъ рабовъ своихъ…”, „Помяни, Господи,…” „За упокой…” (**Дзятлавічы [пр.]**); „Помяни, Господи, во Царствии своемъ Небесномъ души рабовъ своихъ…”, „Помяни, Господи, души рабовъ своихъ…”, „За упокой…” (**Слуцк Св. Канстанціна і Алены [пр.]**); „Помяни, Господи, души усопшихъ рабовъ твоихъ…”, „Помяни, Господи, души рабовъ твоихъ…” (**Слуцк, Св. Тройцы XVIII [пр.]**); „Помяни, Господи, душу рабовъ своихъ…”, „Помяни, Господи, душу раба Божого…” (**Данілавічы [ун.]**); „Помяни, Господи, душы рабовъ своихъ…”, „Помяни, Господи, раба твоего…” (**Дукора [ун.]**); „Помени, Господи, душъ усопших рабъ твоихъ…”, „Сие поминание…” (**Зубачы [ун.]**); „Помяни, Господи, душу рабовъ Божихъ…”, „Помяни, Господи, душу рабовъ своихъ…”, „Помяны ихъ, Господи, во Царствіі Небесномъ…”, „Помені, Господе, въ Царстве Своемъ Небесномъ…”, „Помяни, Господи, душу усопшихъ рабовъ твоихъ…” **(Перавалока [ун.])**; „Помяни, Господи, души рабъ твоихъ…” (**Смалявічы [ун.]**); „Помяни, Господи, души усопшихъ рабъ своихъ…” (**Супрасль [ун.]**); „Помяни, Господи, душу раба твоего…” (**Узда [пр.])**

Найбольш распаўсюджаная формула памінання „Помяни, Господи, души…” паўплывала на змест каменных надмагілляў з эпітафіямі. На кірылічных помніках XVI–XVIII стст. можна сустрэць эпітафіі, якія паўтараюць формулу ўпісання ў памяннік: „Помяни, Господи, Андрея Калины”, „Упокои, Господи, душу раба твоего Лукияна в Царстве своем”[43], „Памяни Раба Божія Конона Булыгу 1760”, „Памяни Раба Божія Калянцеяку. Вечная памятъ”, „Помяні, Господи, душу усопшего раба Игната. 1702”[44]. Функцыя гэтых надмагілляў так і вызначалася – быць своеасаблівымі каменнымі памяннікамі.

Дакладнае ўстанаўленне асоб, якія былі ўпісаны ў памянніку, дае магчымасць вызначыць т.зв. „глыбіню памяці” дакумента. Зразумела, што туды маглі быць унесеныя персанажы з больш ранніх часоў. Але наколькі даўнімі былі тыя часы? Для вызначэння гэтай глыбіні найбольш прыдаецца другая частка памянніка, куды ўносіліся імёны свецкіх асоб. Першая частка з імёнамі патрыярхаў, мітрапалітаў і мясцовых епіскапаў для пастаўленай задачы прыдаецца мала – лакальныя памяннікі маглі проста капіраваць гэтыя звесткі з епархіяльных альбо мітрапаліцкіх. Прапанаваная намі методыка часам давала нечаканы вынік. Напрыклад, у памянніку царквы ў м. Смалявічы Мінскага павета, складзеным у 1738 г., на тытульным аркушы згадваюцца

[43] Д.В. Лісейчыкаў, *«Ходилъ до церкви и тамъ надгробокъ писаныи виделъ…»…*, s. 83, 87.

[44] Д.В. Віцько, М.А. Баравуля, *Падпісаныя помнікі XVIII ст. на старых могілках вёскі Свірыдаўка Крупскага раёна*, „Архіварыус”, вып. 18, 2020, s. 129–131.

падзеі нібыта 1507 г.[45] Аднак, у першай, агульнай частцы памянніка асобы патрыярхаў і мітрапалітаў не згаданы паіменна, што наводзіць на думку аб спробе „ўстаражытніць" памяннік і глыбіню ягонай памяці. Калі ж уважліва паглядзець, хто з'яўляецца першай названай па імені асобай сярод царкоўных іерархаў, то мы ўбачым, што гэта праваслаўны епіскап магілёўскі і беларускі Сільвестр Чацвярцінскі († 1727)[46]. Гэтыя звесткі сведчаць, што ў 1727 г. царква яшчэ падпарадкоўвалася праваслаўнай юрысдыкцыі (Смалявіцкая царква, сапраўды, стала ўніяцкай толькі ў 1730-я гг.). Такім чынам, рэальная глыбіня памяці дадзенага памянніка не 230 гадоў, а ўсяго 10. Больш падрабязныя падлікі паводле прапанаванай методыкі гл. у Табліцы 3.

Табліца 3. Глыбіня памяці памяннікоў цэркваў і манастыроў Вялікага Княства Літоўскага XVII–XVIII стст.

| Населены пункт | Пачатак складання | Самыя раннія звесткі | | Глыбіня памяці |
|---|---|---|---|---|
| | | **Духоўныя асобы** | **Свецкія асобы** | |
| **Супрасль**, м. (ун.) | 1631 г. | 988 г. (кіеўскі мітрапаліт Міхаіл) | 1420-я гг. (гродзенскі баярын Ходзька (Фёдар) Юр'евіч) | ~650/210 гадоў |
| **Слуцк**, г. Св. Тройцы (пр.) | 1637 г. | 1420-я гг. (літоўскі мітрапаліт Рыгор Цамблак) | 1500-я гг. (гаспадарскі дваранін Богуш Багавіцінавіч) | ~210/130 гадоў |
| **Перавалока**, в. (ун.) | 1663 г. | 1632 г. (слонімскі пратапоп Ян Ількоўскі) | 1663 г. (кароль Ян Казімір Ваза) | ~30/0 гадоў |
| **Велікарыта**, в. (ун.) | 1680-я гг. | 1680-я гг. (велікарыцкі святар Мацей Паўловіч) | ? | ~0 гадоў |
| **Зубачы**, м. (ун.) | 1683 г. | 1431 г. (кіеўскі мітрапаліт Фоцій) | 1500-я гг. (луцкі ключнік Багдан Сенькавіч Госцкі) | ~250/180 гадоў |
| **Жыровічы**, м. (ун.) | 1710-я гг. | 1522 г. (кіеўскі мітрапаліт Іосіф Солтан) | 1554 г. (гаспадарскі маршалак Аляксандр Солтан) | ~190/160 гадоў |
| **Узда**, м. (ун.) | 1716 г. | 1710-я гг. (уздзенскі святар Іосіф Ральцэвіч) | ? | ~0 гадоў |
| **Слуцк**, г. Св. Тройцы (пр.) | 1720-я гг. | 988 г. (кіеўскі мітрапаліт Міхаіл) | 1500-я гг. (гаспадарскі дваранін Богуш Багавіцінавіч) | ~740/220 гадоў |

[45] НГМРБ, кп 471. *Памяннік царквы ў м. Смалявічы Мінскага павета*, арк. 25.
[46] *Tamże, арк 2.*

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Грозава**, м. (пр.) | 1730-я гг. | 1631 г. (кіеўскі мітрапаліт Іоў Барэцкі) | 1575 г. (віленскі кашталян Фёдар Агінскі) | ~100/160 гадоў |
| **Смалявічы**, м. (ун.) | 1738 г. | 1727 г. (магілёўскі епіскап Сільвестр Чацвярцінскі) | 1507 г. (вялікі гетман літоўскі Канстанцін Іванавіч Астрожскі) (**запіс сфальсіфікаваны!**) | ~10 гадоў |
| **Слуцк**, г. Св. Канстанціна і Алены (пр.) | 1740-я гг. | 1488 г. (кіеўскі мітрапаліт Сімяон) | 1377 г. (вялікі князь літоўскі Альгерд) | ~260/370 гадоў |
| **Данілавічы**, в. (ун.) | 1745 г. | 1740-я гг. (данілавіцкі святар Міхал Пякарскі) | ? | ~0 гадоў |
| **Дзісна**, м. (пр.) | 1745 г. | 1631 г. (кіеўскі мітрапаліт Іоў Барэцкі) | 1676 г. (расійскі цар Аляксей Міхайлавіч Раманаў) | ~110/70 гадоў |
| **Дзятлавічы**, в. (пр.) | 1753 г. | 1647 г. (кіеўскі мітрапаліт Пётр Магіла) | 1584 г. (расійскі цар Іван IV) | ~110/170 гадоў |
| **Дукора**, м. (ун.) | 1755 г. | 1750-я гг. (кіеўскі мітрапаліт Фларыян Грабніцкі) | 1700-я гг. (польны гетман літоўскі Рыгор Агінскі) | ~0/50 гадоў |

Як бачым, часта памяннікі ўвогуле не апелявалі ні да якой лакальнай памінальнай традыцыі, а пачыналі назапашванне памяці фактычна з нуля (**Данілавічы [ун.], Пераволока [ун.], Смалявічы [ун.], Узда [ун.]).** Сумневы выклікае і глыбіня памяці Дзятлавіцкага памянніка, складзенага ў 1753 г., дзе ў якасці самай ранняй свецкай асобы адзначаны расійскі цар Іван IV (1580-я гг.). Справа ў тым, што на старонках Слуцкага Траецкага памянніка XVIII ст. маецца пазнака: „NB. Следующіе же Высочайшіе персоны виписаніе с реестру, печатанного в Москве 1739 года декабря 11 дня"[47], пасля якой ідзе ўпісанне Івана IV і яго наступнікаў. Роўна ў такой жа паслядоўнасці пададзены расійскія манархі і ў дзятлавіцкім памянніку. Да таго ж, вядома, што Дзятлавіцкі манастыр быў заснаваны ў 1620-х гг. Але ў цэлым, дзякуючы шкале, выкладзенай у Табліцы 3, можна рэканструяваць асноўныя гістарычныя падзеі і шэраг знакавых постацей для таго ці іншага храма. Напрыклад, памяннік праваслаўнага манастыра ў м. Грозава Навагрудскага павета распачынаецца памінаннем царкоўных іерархаў ад іерусалімскага патрыярха Феафана III († 1644), які ў 1620 г. у часе свайго візіту ў Рэч Паспалітую аднавіў праваслаўную іерархію. Сярод кіеўскіх мітрапалітаў першым згадваецца высвечаны

[47] *Памяннік манастыра Св. Тройцы ў г. Слуцку Навагрудскага павета*, НГМРБ, кп 513., k. 4.

іерусалімскім патрыярхам Феафанам III Іоў Барэцкі († 1631). Сярод вышэйшых іерархаў першымі таксама згадваюцца імёны канстанцінопальскага патрыярха Афанасія III († 1654), які браў удзел у рэформах маскоўскага патрыярха Нікана, і антыахійскага патрыярха Макарыя III, удзельніка маскоўскіх сабораў 1656 і 1666–1667 гг. У гэтым плане грозаўскі праваслаўны памяннік у духоўных справах апелюе да аднаўлення праваслаўнай іерархіі ў Рэчы Паспалітай 1620-х гг., а ў свецкім – да расійскага цара Пятра Аляксеевіча Раманава. Падобная карціна назіраецца і ў выпадку з царквой Уваскрэсення Божага праваслаўнага манастыра ў м. Дзісна Полацкага ваяводства. Памяннік уніяцкага манастыра ў м. Жыровічы Слонімскага павета апелюе да пачатку XVI ст. – часоў сваіх першых вядомых фундатараў з роду Солтанаў, як духоўных, так і свецкіх. Паказальная гісторыя з абодвума памяннікамі Слуцкага Траецкага манастыра – 1630-х гг. і 1720-х гг. Многія роды і асобы ў іх аднолькавыя, аднак у духоўным плане першы з іх апелюе да часоў мітрапаліта Літоўскага і Усёй Русі Рыгора Цамблака 1410-х гг., другі ж, складзены ў перыяд, калі слуцкія архімандрыты пачалі паступова патрапляць у сферу ўплыва маскоўскага праваслаўя, першым пачаў узгадваць кіеўскага мітрапаліта часоў хрышчэння Русі ў 980-х гг. Міхаіла.

Своеасаблівае запазычанне сюжэтаў і асоб для памінання можна ўбачыць і на прыкладзе іншых памяннікоў, у асноўным – манастырскіх. Слуцкі праваслаўны манастыр Св. Тройцы (у прадмесці Трайчаны) з даўніх часоў меў цесныя сувязі з кіеўскім Пустынна-Мікольскім, а слуцкія архімандрыты да 1790-х гг. напрамую падпарадкоўваліся кіеўскім мітрапалітам. Як вынік – асобнымі старонкамі ў слуцкім памянніку ўпісаны імёны пустынна-мікольскіх манахаў[48]. Іх пераліку папярэднічае разгорнуты каментарый, з якога вынікае, што ў 1517 г. слуцкі архімандрыт Іосіф разам з пустынна-мікольскім ігуменам Сергіем заключылі дамову ўпісваць імёны памерлых манахаў у памянніку абодвух манастыроў:

> „Аще которій брать по воли Господней преставится в обители Свято Троецкой Слуцкой, а дойдеть писменное о преставленіи такого брата обявленіе до обители Свято Николаевской Кіевской, то имя его должно вписатися в помянникъ обителы Свято Николаевскія Кіевскія, взаимно же"[49].

Дзятлавіцкі манастыр, які быў заснаваны ў 1620-х гг. кіева-пячэрскімі манахамі і называўся „Новапячэрскі", таксама захоўваў цесныя сувязі са сваім старэйшым „калегам". Вялікую частку аб'ёма дзятлавіцкага памянніка складаюць пералікі кіева-пячэрскай брацііі. Механізм абмену імёнамі быў такі самы, як і у выпадку са слуцкім памяннікам. Напрыклад, 17 сакавіка 1782 г. кіева-пячэрскі архімандрыт Засіма паведамляў у Дзятлавічы аб пастрыжэнні ў Кіеве ў саборнай Успенскай царкве 17 новых манахаў

[48] *Памяннік манастыра Св. Тройцы ў г. Слуцку Навагрудскага павета*, НГМРБ, кп 513, k. 37–37v.
[49] Tamże, k. 36v.

„за всегдашней об них молбою, кому надлежить повелеть в синодикъ вписать, о получении жъ сего ордера и должномъ по нему исполнении рапортовать"[50].

Часам на пачатку памянніка складальнік пісаў засцерагальныя формулы-праклёны ад самавольных упісанняў (**Слуцк, Св. Тройцы XVII ст. [пр.]**) Выглядае, што самавольныя ўпісанні былі найвялікшай праблемай у сельскіх парафіяльных цэрквах. Асабліва шмат самавольных упісанняў сустракаецца ў памянніку ўніяцкай царквы ў в. Пераволока Слонімскага павета. Прычым такая традыцыя бытавала тут і ў XVII, і ў XVIII, і ў XIX стагоддзях. Самастойна ўпісаў сябе ў памяннік, напрыклад, Мікалай Аксамітоўскі са сваёй жонкай Крысцінай Казуляй:

„Iż ja sobie upatrzywszy upisałem się do sobotnika przewłockiego na co się ręką moją podpisuję się. Pisan roku 1695 dnia 26 [novem]bra"[51].

Падобную сітуацыю мы назіраем пры гэтай жа царкве і праз 150 гадоў: „Ród i pominanyje Kalinkiewiczów. Wpisany hoda Hospodniaho 1832 miesiąca genwarii dnia 12 czrez Joanna Kalinkiewicza" [52].

Найбольш інфарматыўнымі для вывучэння штодзённага жыцця тагачасных жыхароў з'яўляецца асноўная частка памянніка, дзе месцяцца нататкі пра цэлыя роды і адзінкавых асоб з тэрыторыі парафіі і аддаленых зямель, якіх належыць узгадваць у малітвах. Інфармацыя, як правіла, структуравалася паводле простай схемы: уверсе аркуша пазначаўся населены пункт, ніжэй ішлі прозвішчы пэўных родаў з пералічэннем імёнаў яго прадстаўнікоў і прадстаўніц. Менавіта такім чынам выглядае абсалютная большасць запісаў.

Здавалася б, такі сціплы фармуляр не можа змяшчаць шмат інфармацыі, аднак гэта не зусім так. Запісы маглі ўтрымліваць звесткі аб сацыяльным і этнічным паходжанні асоб: „старац" (**Дукора [ун.]**), (**Смалявічы [ун.]**); „хихлач" (казак) **(Зубачы [ун]**); „палонны" (**Пераволока [ун.]**); „ліннік" (рамеснік, які вырабляе вяроўкі), „млынар", „пастух", „шляхетна народжаны, захожы з Кароны Польскай з Варшаўскай зямлі" (**Смалявічы [ун.]**) У адносінах да шляхты выкарыстоўваліся азначэнні „родъ пана", „родъ благородного", „родъ шляхетного".

Важную інфармацыю магло ўтрымліваць пазначэнне прычынаў смерці – каб зафіксаваць такую акалічнасць патрэбны былі важкія падставы. Гэта

[50] *Ліст-ордэр архімандрыта Кіева-Пячэрскай лаўры Зосімы да ігумена Дзятлавіцкага Праабражэнскага манастыра іераманаха Мялеція Бувайлы з паведамленнем аб пастрыжэнні ў манаства ў лаўры ў саборнай Успенскай царкве 17 чалавек, а таксама з просьбай аб унясенні іх імёнаў у сінодзік і маленні за іх*, 1782 г., НГМРБ, кп 045843/306.

[51] *Поменник Переволоцької церкви. XVII–XIX стст.*, Інститут рукопису Національної бібліотеки України імені В. І. Вернадського (dalej: ІР НБУ), ф. 301, нр 566Л, k. 10v.

[52] Tamże, k. 27.

маглі быць войны: „Іоана Яблонского, презбитера Клищелского Ніколского, которого венкри змучилі року 1657" (паход войск трансільванскага князя Дзьёрдзя Ракацы на Падляшша) (**Зубачы, [ун.]**). У родзе капітана расійскіх войскаў Ігната Дурнова, а таксама данскога казака Анісіма амаль усе мужчынскія прадстаўнікі роду пазначаны як „убиенные" (**Дзісна [пр.]**) „Убиенные" і „утопшие" фіксуюцца ў многіх іншых памянніках (**Грозава [пр.]**), **Смалявічы [ун.]**) Знаходзілі адлюстраванне хваробы і эпідэміі: войт м. Высокае Брэсцкага павета Стэфан Бяльковіч і яго сям'я „преставіся у поветрие року 1657" (**Зубачы [ун.]**), „Февроніи, попади переволоцкои, умерла року 1688 месяца февраля 8 дня з горячки" (**Паравалока [ун.]**) Няшчасныя выпадкі: „Младенца Никиту, землею прибитыи скончался" (**Зубачы [ун.]**), „внезапною смертію 1779 года" (**Слуцк. Св. Канстанціна і Алены [пр.]**)

Часам сацыяльнае паходжанне і прычыны смерці афармляліся ў паслядоўную гісторыю, якая мела важнае значэнне для лакальнай супольнасці пэўнай канфесіі. У памянніку царквы Уваскрэсення Божага праваслаўнага манастыра ў м. Дзісна Полацкага ваяводства маецца запіс аб сям'і генерал-маёра расійскай арміі Івана Сцяпанавіча Горбава[53]. Ён быў удзельнікам Вялікай Паўночнай вайны, у 1703 г. у званні палкоўніка ўзначаліў „драгунскі палкоўніка Івана Сцяпанавіча Горбава полк". У 1706 г. разам са сваёй вайсковай часткай вылучыўся пры блакадзе г. Гродна, за што атрымаў званне брыгадзіра, а ў 1707 г. – генерал-маёра. І.С. Горбаў памёр у м. Асвея Полацкага ваяводства 26 кастрычніка 1707 г. Адразу пасля запісу аб сям'і гэтага чалавека ідуць запісы аб сем'ях іншых расійскіх вайскоўцаў: капітана Ігната Яўстаф'евіча Дурнова і данскога казака Анісіма. Магчыма, яны таксама загінулі непадалёк ад Дзісны ў час Вялікай Паўночнай вайны. Цікавасць выклікае наяўнасць у гэтым жа памянніку рода палкоўніка расійскіх войскаў Аляксея Кузьміча Балабанава[54]. У 1704–1706 гг. ён камандаваў адным з палкоў гарнізона ў г. Нарва[55]. Запіс быў унесены пры жыцці Балабанава, бо ў 1714 г. яму было прысвоена званне брыгадзіра і ў такім разе ён быў бы ўнесены ў памяннік з больш высокім званнем. Апошнія згадкі пра гэтага персанажа датуюцца 8 верасня 1721 г., калі расійскі імператар дасылаў яму ліст у г. Пернаў (суч. г. Пярну, Эстонія). Што ён рабіў у ваколіцах Дзісны і чым заслужыў упісанне сваёй сям'і ў памяннік – застаецца пад пытаннем. Аднак, відаць, што прысутнасць расійскай арміі ў ваколіцах Дзісны ў час Вялікай Паўночнай вайны мела надзвычай важнае значэнне для мясцовага праваслаўнага манастыра, які знаходзіўся ў атачэнні рымска- і грэка-каталіцкіх парафій.

[53] *Ліст-ордэр архімандрыта Кіева-Пячэрскай лаўры Зосімы да ігумена Дзятлавіцкага Праабражэнскага манастыра іераманаха Мялеція Бувайлы з паведамленнем аб пастрыжэнні ў манаства ў лаўры ў саборнай Успенскай царкве 17 чалавек, а таксама з просьбай аб унясенні іх імёнаў у сінодзік і маленні за іх,* 1782 г., НГМРБ, кп 045843/306.

[54] Tamże.

[55] *Биохроника Петра Великого (1672–1725 гг.)* https://spb.hse.ru/humart/history/peter/ (dostęp: 23.03.2024).

У адрозненне ад метрычных кніг памяннікі не фіксавалі дату смерці. Для таго, каб такая інфармацыя была ўнесена, павінны былі быць важкія прычыны. Напрыклад, гэта маглі быць асобы фундатараў храма, настаяцеляў манастыроў, святароў і членаў іх сем'яў. У памянніку ўніяцкай царквы ў м. Зубачы Брэсцкага павета адзначаны даты смерці святара царквы ў м. Сямяцічы Брэсцкага павета Самуіла Стомы-Смаленскага (1683, месяц і дзень зацёртыя), яго жонкі Марыі Хілінскай (14.06.1682), святара той жа царквы Гаўрыіла Духноўскага (01.05.1757) і яго сына Яна (05.07.1763), жонкі святара царквы ў м. Зубачы Ганны Духноўскай (14.02.1754, „часа 2 по полунощи"), сына святара царквы ў м. Зубачы Аляксея Кавальскага (1758), ксяндза-пробашча ў м. Мілейчыцы Брэсцкага павета Войцеха Класовіча (10.10.1768 „годины первои пополудни") (**Зубачы [ун.]**). У памянніку праваслаўнага манастыра ў м. Грозава Навагрудскага павета адзначаны даты смерці ігумена Антона Дзёрткі (10.12.1758) і гомельскага старосты Мікалая Красінскага: „преставися в Менску року 1730 месяца февру(ария) дня 1 в неделю зрана" (**Грозава [пр.]**). У памянніку ўніяцкай царквы Арханёла Міхала ў в. Паравалока Слонімскага павета адзначаны даты смерці святара царквы ў в. Варанілавічы Фёдара Ількоўскага – снежань 1661 г. і жонкі паравалоцкага святара Фяўронні – 8 лютага 1688 г., а таксама „Томаша Демяновѣча, преставѣлся от сего суетнаго мѣра року 1696", „Іакуба Евхутича, <…> преставилъся от сего суетнаго мѣра року 1696 іануарі дня 23" (**Паравалока [ун.]**) Часам святары камбінавалі метрычныя кнігі аб памерлых з памяннікамі, дапісваючы паверх запісаў аб смерці памінальныя формулы. Такая практыка бытавала, напрыклад, ва ўніяцкай царкве в. Крыўчыцы Пінскага павета ў 1770-1790-х гг.[56] У нататках пра памерлых святарскіх дзяцей (напэўна, найбольш эмацыйных для складальнікаў) мог быць адзначаны і іх узрост: дачка зубацкага святара Марыяна пражыла 1,5 гады, яго сын Іван пражыў 1,5 гадзіны, сын сямяціцкага святара пражыў 22 гады (**Зубачы [ун.]**)

Практычна ніколі памяннікі не фіксавалі ступень сваяцтва прадстаўнікоў аднаго роду – пасля прозвішча, як правіла, падаваўся просты пералік імёнаў асоб, якія да яго належалі. Рэдкім выключэннем выглядае памяннік уніяцкай царквы ў в. Велікарыта Брэсцкага павету, дзе гэтыя сувязі адзначаліся. З памяннікоў астатніх храмаў можна прывесці толькі адзінкавы прыклад Трахіма Кярдоцькі з в. Вялікая Кракотка, які пры ўпісанні імёнаў крэўных папрасіў пазначыць ступень іх сваяцтва: „дедъ", „бабку", „отца" (**Паравалока [ун.]**).

У выпадку з важнымі для храма памерлымі асобамі побач з іх імёнамі магло пазначацца і дакладнае месца пахавання: „Положоно тело в церкви Семятицкои пред образом Пресвятои Богородици наместным" 14.06.1682, „Лежитъ тело в церкви Семятицькои под Великимъ Олтаромъ" 01.05.1757, „Лежитъ въ Семятычахъ", „Leżyt tyło ioho w cerkwi Werchowickoy", „Лежатъ

---

[56] *Метрычныя кнігі аб народжаных і шлюбаваных царквы ў в. Крыўчыцы Пінскага павета*. 1745–1794 гг., НГАБ, ф. 800, воп. 1, нр 2, k. 1.

тела ихъ в церкви Зубацкои при левои страни въ левого олтара", „Лежитъ тило в церкви Семятыцъкои", „Которого тило лезит при церкви Верховицкои", (**Зубачы [ун.]**), „Преставилъся въ Анополу, фолварку своимъ. Похоронянъ въ Копылу на могилкахъ" (**Грозава [пр.]**, „Лежащих в церкви Переволоцкои" (**Пераволока [ун.]**), ігумен Дзяніс Вараноўскі, які пачаў складаць памяннік у 1753 г. „которїй здесь и лежитъ в церквѣ под амфоном" (**Дзятлавічы [пр.]**).

Памяннікі ўтрымлівалі імёны прадстаўнікоў не толькі сваёй канфесіі. Фундатарамі многіх цэркваў і манастыроў былі рымска-каталіцкія і пратэстанцкія роды. Асобы фундатараў уносіліся ў памяннік без акцэнту на іх адрознай канфесійнай прыналежнасці. Пазначэнні кшталту „римского закону" былі рэдкасцю (**Зубачы [ун.]**). У адносінах да кантраверсійных постацей у гісторыі ўзаемадачынення цэркваў *ritus graeci* і *ritus latini* магла быць адлюстравана нават своеасаблівая міжканфесійная палеміка. Напрыклад, памяннікі праваслаўных і ўніяцкіх манастыроў дыяметральна супрацьлегла ацэньвалі постаць кіеўскага мітрапаліта Міхаіла Рагозы, які падпісаў акт Брэсцкай уніі 1596 г.: „По Онисифоры былъ отступникъ Михаилъ Рогоза, жил 1593" (**Слуцк, Св. Тройцы XVIII ст. [пр.]**), „Міхаіл Рагоза, мітрапаліт, які ў 1595 годзе 23 снежня з усімі рускімі епіскапамі і народам аддаў паслушэнства святому айцу Рымскаму Папу Клеменсу VIII" (**Жыровічы [ун.]**). Адмоўна ставіліся праваслаўныя памяннікі і да мітрапаліта Ісідора, які стагоддзем раней прыняў Фларэнційскую ўнію: „По Грігоріи былъ Исидоръ, которій в Флоренціи отступилъ, жилъ 1430" (**Слуцк, Св. Тройцы XVIII ст. [пр.]**). Цікавай адметнасцю некаторых памяннікоў былі ўпісанні родаў яўрэеў-пярэхрэстаў: „Род пана Антонія, неофиты зъ евреіовъ, Губинскіхъ зъ Черніцы, котори преизволілъ веру християнскую принять" (**Смалявічы [ун.]**) На прыкладзе яўрэя-пярэхрэста Майсея Песаха з м. Зубачы Брэсцкага павету можна ўбачыць, што пры хрышчэнні яму было нададзена імя Раман, а яго нашчадкі ў памянніку запісаны двойчы – і пад прозвішчам Песаховіч, і пад прозвішчам Раманюк (**Зубачы [ун.]**). У тым жа памянніку ёсць падвойны запіс аб памінанні рабоў Божых Ісака і Аўрама, і гэтых жа асобаў пад імёнамі Марка і Астапкі. Магчыма, у гэтым выпадку гаворка таксама ідзе пра яўрэеў-пярэхрэстаў.

Калі нехта з парафіянаў альбо пілігрымаў рабіў каштоўнае ахвяраванне на карысць храма, гэты факт таксама мог быць адлюстраваны ў памянніках. Міхал Кудзіновіч з сям'ёй быў упісаны за тое, што ахвяраваў царкве звон (**Дукора [ун.]**) Графіня Ганна Аляксееўна Арлова-Часменская – за тое, што ахвяравала Пінскаму Багаяўленскаму манастыру 5 рублёў (**Дзятлавічы (ун.**) Там жа на палях насупраць аднаго з імён іерасхіманахаў было пазначана: „Еѵ[ан]г[елие] далъ". Асобы трох жанчын, якія ахвяравалі атласныя рызы царкве ў м. Зубачы Брэсцкага павета, былі занатаваны без пазначэння імёнаў: „Помени, Господи, рабынь своих трох по имени ихъ, по которих рызы атласовыи в церкви Зубацкои естъ" (**Зубачы [ун.]**). Род Якуба Кісяля быў унесены ў памяннік манастыра ў м. Грозава Навагрудскага павету за тое, што „надали каделн(и)цу сребную" (**Грозава [пр.]**), у гэтай жа кнізе далей чытаем:

„1760 m[iesią]ca [octo]bris d[nia] 1 do monastira S[więt]to Janskaho płaszczenicu nadała Czayczycha Агафія iz Słucka". Існавалі асобныя раздзелы, для ўпісання памінання родаў не са сваёй мясцовасці: „Rody stranstwuiuszczych" (**Дукора [ун.]**), „З розныхъ парохии уписаніе людеи" (**Зубачы [ун.]**, „Імена людей странныхъ, послушниковъ и подданыхъ архимандріи Свято Троецкія Слуцкыя", „Імена различнаго состоянія людей благочестивых" (**Слуцк, Св. Тройцы XVIII ст. [пр.]**).

* * *

Такім чынам, можна падвесці шэраг папярэдніх вынікаў нашага даследавання. Пры цэрквах *ritus graeci* на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў XVII–XVIII стст. інтэнсіўнасць вядзення памяннікоў была ў некалькі разоў меншая за цэрквы на „Каронных" землях Кіеўскай мітраполіі. На тэрыторыі ВКЛ у дачыненні да памяннікоў найчасцей выкарыстоўваўся тэрмін *суботнік*, вядомы з самага пачатку XV ст., у той час як на „Каронных" землях большай папулярнасцю карыстаўся тэрмін *памяннік*. Адзіны з выяўленых рукапісаў, які меў саманазву *памяннік*, быў складзены ў Жыровіцкім базыльянскім манастыры ў 1710-х гг. верагодна выхадцам з „Каронных" земляў. У праваслаўным асяроддзі ў XVIII ст. адбылося вяртанне да архаічнага тэрміна *сінодзік*, што мусіла падкрэсліць вытокі самой традыцыі царкоўнага памінання – гістарычнай назвы царкоўнай службы „Чын праваслаўя" альбо „Сінодзік", складзенай у 843 г. у гонар перамогі над іконаборцамі. Ва ўніяцкай частцы Кіеўскай мітраполіі і ў XVII, і ў XVIII стст. працягвалася выкарыстанне тэрміна *суботнік*.

Мовамі складання аналізуемых помнікаў былі царкоўнаславянская і „руская". Царкоўнаславянскім быў сам фармуляр запісу ў памяннік, паколькі ён адпавядаў формуле „ад чалавека да Бога", а таксама разгорнутыя прадмовы да манастырскіх памяннікоў. „Руская" мова выкарыстоўвалася ў простанародных варыянтах запісу імёнаў уласных, пазнаках аб часе смерці, месцы пахавання некаторых асоб, пры пазначэнні іншай дадатковай інфармацыі – усяго таго, што адпавядала формуле „ад чалавека да чалавека". У другой палове XVIII ст. у гэтых дадатковых пазнаках „рускую" мову замяніла польская, але гэта тычылася толькі памяннікоў уніяцкіх цэркваў. Ва ўніяцкіх жа памянніках прыблізна з другой чвэрці XVIII ст. назіраецца паступовая замена кірылічнай графікі на лацінскую з захаваннем царкоўнаславянскай і „рускай" лексікі. Памінальныя формулы, узятыя з памяннікоў, непасрэдным чынам уплывалі на надпісы-эпітафіі, якія наносіліся на каменныя надмагіллі. Шэраг выяўленых надмагільных помнікаў XVI–XVIII стст. з земляў ВКЛ утрымлівае надпісы памянніковага тыпу.

Глыбіня памяці памяннікоў была самай рознай, яны апелявалі да розных гістарычных падзей і знакавых постацей сярод духоўных і свецкіх асоб. Памяннікі дробных сельскіх парафій часта распачыналі назапашванне традыцыі памінання фактычна з нуля – з імёнаў дзейных архірэяў і дзейных свецкіх патронаў царквы. Памяннікі іншых цэркваў і манастыроў,

наадварот засведчылі існаванне даўняй памінальнай традыцыі з узгадкай знакавых гістарычных постацей – вялікіх князёў літоўскіх, расійскіх цароў, канстанцінопальскіх патрыярхаў, кіеўскіх мітрапалітаў і інш. Глыбіня памяці асобных памяннікоў дасягала некалькіх стагоддзяў, а ў іх памінальнай традыцыі можна ўбачыць яскравыя сюжэты лакальнай гісторыі.

Апрача астатняга, памяннікі з'яўляюцца неацэннай крыніцай па рэканструкцыі штодзённага жыцця невялікіх лакальных супольнасцей. Паводле іх зместу можна ўбачыць якія імёны, прозвішчы і мянушкі бытавалі ў той ці іншай мясцовасці ў XVII–XVIII стст., які быў геаграфічны ахоп памянніка – прадстаўнікі якіх родаў і з якіх суседніх альбо аддаленых парафій былі сюды ўпісаны, якія буйныя хрысціянскія цэнтры былі своеасаблівым духоўным арыенцірам у канкрэтнай мясцовасці – Вільня, Канстанцінопаль, Кіеў, Масква і інш. Прыведзены ў канцы артыкула пералік выяўленых памяннікоў з разгорнутымі асабовым і геаграфічнымі паказальнікамі, спадзяемся, паслужыць асновай для далейшых даследаванняў гэтых цікавых помнікаў царкоўнай гісторыі.

**Aneks:**
**Пералік памяннікоў XVII–XVIII стст. цэркваў і манастыроў *ritus graeci* з тэрыторый Вялікага Княства Літоўскага**

**Фармуляр апісання памянніка:**
*Парадкавы нумар*
*1. Населены пункт, аб'ект.*
*2. Павет/ваяводства ВКЛ*
*3. Сучасная адміністрацыйная прыналежнасць.*
*4. Скрайнія даты.*
*5. Арыгінальны загаловак.*
*6. Асабовы паказальнік.*
*7. Геаграфічны паказальнік.*
*8. Месцазнаходжанне, каардынаты.*
*9. Выява тытульнага аркуша.*

**№ 1.**
1. **Велікарыта**, в., уніяцкая царква.
2. Брэсцкі павет Брэсцкага ваяводства.
3. Маларыцкі раён Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь.
4. 1680-я гг. – пач. XIX ст.
5. Арыгінальны загаловак адсутнічае.
6. і 7. Апісанне: Гильтебрандт П., *Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки*, вып. 1, Вильна 1871, s. 53–54; Ф.Н. Добрянский, *Описание рукописей…*, s. 186–187; Нікалаеў М., *Палата кнігапісная…*, s. 77.
8. LMAVB, rs. f. 19, nr 90.

**№ 2.**
1. **Грозава**, м., праваслаўны манастыр Яна Багаслова, царква Успення Багародзіцы.
2. Навагрудскі павет Навагрудскага ваяводства.
3. Капыльскі раён Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь.
4. 1730-я гг. – 1840-я гг.
5. Арыгінальны загаловак адсутнічае.
6. Асабовы паказальнік: 6.1. Агульная частка: канстанцінопальскія, іерусалімскія і антыахійскія патрыярхі, кіеўскія мітрапаліты, імператары і імператрыцы [расійскай дынастыі Раманавых], кіеўскія і галіцкія архіепіскапы, магілёўскія епіскапы, луцкія і астрожскія епіскапы, пераяслаўскія і барыспольскія епіскапы, мінскія архіепіскапы, кіева-пячэрскія архімандрыты, слуцкія архімандрыты, грозаўскія ігумены, грозаўскія іераманахі, віленскія святадухаўскія манахі, віленскія святары і дыяканы, віленскія братчыкі [раздзел незапоўнены], святары, дыяканы. 6.2. **Агінскі** Фёдар; **Адынец** Ян, пан, род; **Арлова-Часменская** Ганна Аляксееўна, графіня; **Бабраўнічы** Кандрат, петрыкаўскі мешчанін, род;

**Быхавец**, пан, род; **Вайцяховіч** Стэфан; **Вайцяховіч** Сямён; **Валадковіч** Марцін, калятар, род; **Ваўковіч** Феадосій, слуцкі архімандрыт, род; **Ваўковіч** Якуб, пан, род; **Верабей** Марцін, род; **Вербаловіч**, пан, род; **Выгоўскі**, пан, род; **Гаховіч**, манах; **Горват**, пан, род; **Гротуз (Гротгуз)** Іван Паўлавіч, ротмістр прускіх войскаў; **Грэгаровічаўна** Хрысціна; **Дзёртка** Антон, грозаўскі ігумен, род; **Дрыбін (Драбін)**, род; **Ждановіч** Тарас, манах, род; **Жук** Барыс, род; **Жук** Іван, род; **Загароўскі**, пан, род; **Зарубенка**, капыльскі мешчанін, род; **Зарэцкі**, род; **Кадзіновіч** Данііл, род; **Казановіч** Раман, іерасхіманах; **Калініч** Сафрон, іераманах; **Калоша**, род; **Каменскі**, іераманах; **Карповіч** Данііл, род; **Карповіч**, пан, род; **Карповіч**, род; **Карсакевіч** Іван, насоўскі мешчанін, род; **Касінскі** Мацей, грозаўскі мешчанін, род; **Кіркевіч**, святар; **Кісель** Якуб, род (двойчы); **Красінскі** Мікалай, гомельскі староста, род; **Красоўскі**, пан, род; **Красоўскі**, род; **Кумовіч**, пан, род; **Лапіцкая** Паўлавая, род; **Лапіцкі** Марцін, слуцкі войт, род; **Лапіцкі** Міхаіл, слуцкі войт, род; **Лупу (Лупул)** Васіль, малдаўскі гаспадар; **Лянгіш** Гаўрыіл, львоўскі мешчанін; **Мелянтовіч** Геранім, пан, род; **Мінкевіч**, іераманах; **Місюк** Прохар, род; **Навічок**, род; **Перагуд**, пан, род; **Петраловіч**, род; **Піневіч** Еўдакія, род; **Пойка (?)** Ігнат, род; **Радзівіл** (у дзявоцтве **Лупу**) Марыя; **Садоўскі** Віталь, іераманах, род; **Салуянчык**, род; **Сіліч**, пан, род; **Сімановіч** Стэфан, протаіярэй, род; **Скрыган** Іван, род; **Смольская**, род; **Струцінскі**, пан, род; **Сухазанет (Сухазагнет)** Пётр, слуцкі „грамадзянін", род; **Сыцько**, пан, род; **Татарынчык**, род; **Тукальскі**, пан, род; **Уладычка** Варлаам, грозаўскі ігумен; **Хацяноўскі**, род; **Хмялеўская** Марыя Іванаўна, капыльская мяшчанка, род; **Храневіч** Ян, пан, род; **Хрысцініч** Ян, пан, род; **Чайка** Агаф'я, слуцкая мяшчанка; **Чапковіч** Афанасій, іераманах, род; **Ярашэвіч** Прохар, пан; **Ярмалінскія**, паны, род.

7. Геаграфічны паказальнік: **Анопаль**, фальв.; **Балгавічы**, в.; **Вільня**, г.; **Востраў**, в.; **Вужа**, в.; **Гомель***, м.; **Грозава**, м.; **Дзятлавічы**, в.; **Дубейкі**, в.; **Жукі**, в.; **Капыль**, м.; **Кіеў***, г.; **Львоў**, г.; **Малдова***, княства; **Насоўка**, м.; **Петрыкаў**, м.; **Прусія***, каралеўства; **Слуцк**, г.; **Старыца**, в.; **Чарнігаўская**, губерня; **Чарнічная**, засц.

8. НГМРБ, кп 444 (40 аркушаў).

9.



**№ 3.**

1. **Данілавічы**, в., уніяцкая царква Пакроваў Багародзіцы.
2. Мінскі павет Мінскага ваяводства.
3. Дзяржынскі раён Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь.
4. 1755.02.14 – 1790-я гг.
5. Арыгінальны загаловак: „Сүботникъ ц(е)ркви Дониловѣцкой, создасѧ на ч(е)*с*ть и на хвалү на престолъ Покровы Пр(е)*с*(вя)тѣй Вл(а)*д*(ы)ч(и)цы н(а)шей Б(огороди)ци и Пр(и)*с*нѡ Д(е)вый[57] М(а)рій. Рабомъ Б(о)жіимъ Михаиломъ Пекарскимъ, презвѵтеромъ дониловскимъ. Рокү аѱ͞не (1755) м(еся)ца феврүарый днѧ дї (14)".
6. Асабовы паказальнік. Агульная частка адсутнічае (не стваралася). **Бабровіч** Казімір, святар, род; **Басарэўскі** Нічыпар, род; **Бобрыкава**; **Будзька** Захар, род; **Дашкевіч** Рыгор, хатлянскі святар, род (двойчы); **Дзешчыц** Цімох, род; **Дзешчыц** Яўхім, род; **Завусцінскі**, святар, род; **Зябора** Ян, род; **Казловіч (Казлоў)** Стэфан, род (двойчы); **Караневіч** Карпей, род; **Караневіч**, род; **Кіцька** Якуб, род; **Міхалоўскі**, род; **Пякарскі** Міхаіл, данілавіцкі святар, род; **Рагачэвіч** Аўлас, род; **Раўтовіч** Стэфан, род; **Семка** Паўлюк, род; **Шамецька**, род; **Шамка** Аляксей (Алаіз?), род; **Шамка** Іван, род; **Шамка** Фёдар, род; **Шарай**, род.
7. Геаграфічны паказальнік: **Данілавічы**, в.; **Хатляны**, в.
8. НГАБ, ф. 136, воп. 13, нр 1098, k. 7v–9v. (3 аркушы).

[57] Так у дакументе.

9.



**№ 4.**

1. **Дзісна**, м., праваслаўны манастыр, царква Уваскрэсення Божага.
2. Полацкае ваяводства.
3. Мёрскі раён Віцебскай вобласці Рэспублікі Беларусь.
4. 1745.03.06 – пач. XIX ст.
5. Арыгінальны загаловак: „Синодикъ[58] м(о)н(а)*с*т(ы)рѧ бл(а)гочестиваго Дисеньскаго Воскр(е)*с*(е)ніѧ Х(ри)*с*(то)ва ц(е)ркви. Преписасѧ годѵ ҂аѱме (1745) ма*р*та ѕ (6)".
6. Асабовы паказальнік: 6.1. Агульная частка: цары і царыцы [расійскай дынастыі Раманавых], князі і княгіні [раздзел незапоўнены], канстанцінопальскія патрыярхі [раздзел незапоўнены], маскоўскія патрыярхі, кіеўскія мітрапаліты, архіепіскапы, епіскапы, архімандрыты, ігумены, іераманахі, іерадыяканы, манахі, манахіні. 6.2. **Алавяшка** Ян, полацкі мешчанін, род; **Аляшкевіч** Мяфодзій, дзісенскі ігумен, род; **Балабанаў** Аляксей Кузьміч, палкоўнік; **Балбекава** Ганна, пані, род; **Барадуліч** Цімафей, дзісенскі бурмістр, род; **Бардзіна** Алена, дзісенская мяшчанка, род; **Бухал** Васіль, пан, полацкі мешчанін, род; **Высоцкі**, род; **Гарбуз** Мікалай, род; **Гласка** Афанасій, дзісенскі ігумен, род; **Глябковіч** Іасаф, іераманах, род; **Горбаў** Іван Сцяпанавіч, генерал расійскіх войскаў, род; **Дубіна** Іван, пан, род; **Дурноў** Ігнат Яўстаф'евіч, капітан, род;

[58] У тэксце памылкова Синоникъ.

**Жардзецкі** Антон, пан род; **Жахоўскі** Тэадор, пан, род; **Закрэўскі** Тэадор, пан, род; **Зніркевіч** Іраклій, іераманах, род; **Ілініч** Грыгорый, дзісенскі бурмістр, род; **Кадрыцкі** Самуіл, дзісенскі ігумен, род; **Казкевіч** Малахія, магілёўскі бурмістр, род; **Кірылаў** Стэфан, род; **Клімуш**, род; **Клыпа** Гаўрыіл, полацкі (?) мешчанін, род; **Корсак** Юзаф, пан, род; **Кохан** Іпаліт, іераманах, род; **Крывейка** Гаўрыіл, дзісенскі бурмістр, род; **Кулага** Серафіён, іераманах, род; **Люцэйковіч** Марфа, бешанковіцкая мяшчанка, род; **Ляташынскі**, іераманах, род; **Ляўковіч** Арцемій, славетны пан, род; **Маняк** Ян, род (двойчы); **Маняк**, род; **Маркіяновіч** Мелхіседэк, іераманах, род; **Мётла**, род; **Мудры** Стэфан, род; **Нарбут** Ірынарх, іераманах; **Палуян** Герман, дзісенскі намеснік, друйскі ігумен, род; **Палякоў** Іерамія, цвярскі мешчанін, род; **Радкевіч** Міхаіл, пан, род; **Расіцкі**, род; **Савін** Васіль, род; **Спірковіч** Лука, дзісенскі бурмістр, род; **Спірковіч** Стэфан, дзісенскі бурмістр, род; **Уладычкін**, род; **Уляшонак** Аляксей, дзісенскі намеснік, род; **Хелхоўскі** Аляксандр, пан, род; **Цыбольская** Ганна, пані, род; **Чалішчаў** Стэфан Сямёнавіч, род; **Чаравушка** Сільвестр, дзісенскі намеснік, род; **Чаравушка**, род; **Швабоўскі** Феадосій, друйскі ігумен, род; **Шыбайла** Андрэй Сідаравіч, дзісенскі бурмістр, род; **Шыманоўскі** Аляксандр, род; **Якавіцкі** Іван, пан, род; **Якоўнік** Амас, род; **Ясніцкі** Іосіф, дзісенскі ігумен, род; **Яцкевічава** Анастасія, род; **Ячны** Міхал, пан, род.

7. Геаграфічны паказальнік: **Бешанковічы**, м.; **Дзісна**, м.; **Друя**, м.; **Канстанцінопаль***, г.; **Кіеў***, г.; **Магілёў**, г.; **Масква***, г.; **Полацк**, г.; **Пскоў**, г.; **Слабада (Мікалаеўская-)**, в.; **Цвер**, г.

8. VUB, f. 3, nr 2634 (18 аркушаў).

9.



**№ 5.**

1. **Дзятлавічы**, в., царква Перамянення Божага праваслаўнага манастыра.
2. Навагрудскі павет Навагрудскага ваяводства.
3. Лунінецкі раён Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь.
4. 1753.12.17 – XIX ст.
5. Арыгінальны загаловак: „Синодик или Собранїе дүшъ, то есть именъ хр(и)стїанъ православныхъ оусопшихъ въ надеждѣ воскр(е)сенїѧ живота вѣчнагω, обоегω пола, всѧкагω чина, дүховнагω и мїрскагω, милостивых бл(а)годѣтелей и оукладщикωвъ длѧ всегдашнѧгω при безкровной жертвѣ помѧновенїѧ ω ωставленїи грѣхωвъ вы*ш*ше помѧнүтыхъ бл(а)гочестнω преставлшихсѧ рабωвъ Б(о)жїихъ. Въ ц(е)рквѣ Преωбраженїѧ Г(о)*с*(по)днѧ, въ монастирѣ Дѧтеловицкомъ составленъ и написанъ своерүчнимъ трүдомъ іеромонаха Дїонѵсїа Вороновскогω, тоѧжъ обители Дѧтеловицкїѧ игүменомъ. Рокү ҂а҃ѱ҃н҃г (1753) м(е)*с*(я)цѧ декемврїа з҃і (17) днѧ”.
6. Асабовы паказальнік: 6.1. Агульная частка: маскоўскія патрыярхі, цары і царыцы [расійскіх дынастый Рурыкавічаў і Раманавых], кіеўскія мітрапаліты, слуцкія архімандрыты, дзятлавіцкія ігумены, архіепіскапы, епіскапы, архімандрыты, ігумены, іераманахі, іерадыяканы, манахі, манахіні. 6.2. **Ажаркоўскі** Гедэон, дзятлавіцкі ігумен, род; **Ажог** Павел, род; **Азерскі** Сілуян, дзятлавіцкі ігумен, род; **Алайкевіч** Іосіф, іераманах, род; **Андзаровіч** Мірон, пан, магілёўскі райца, род; **Арлова-Часменская** Ганна Аляксееўна, графіня; **Асманіцкі** Алімпій, дзятлавіцкі намеснік, род; **Базілевіч** (**Васілевіч**) Юстын, белгарадскі мітрапаліт, род; **Бальніцкі** Якім, іерадыякан, слуцкі (?) свята-траецкі паслушнік, род; **Бандаўскі** Захар, род; **Барэніцкі** Іосіф, іераманах, род; **Белавус** Якім, род; **Бесан** Іван, род; **Бесан** Лаўрэн, род; **Бесанаўна** Агаф'я, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род; **Бесанаўна** Ганна, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род (двойчы); **Бесанаўна** Феадосія, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род; **Бічоўскі** Хрысанф, іераманах, род; **Бічык** Пётр, род; **Бразіна** Пётр, дзятлавіцкі войт, род; **Бранцэвіч** Міхаіл, род; **Бруцкі** Пахомій, манах, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Бувайла** Мялецій, дзятлавіцкі ігумен, род; **Бункевіч** Лявонцій, дзятлавіцкі намеснік, род; **Бурмака** Зіновій, род; **Бурэйка**, род; **Буткевіч** Іпаліт, дзятлавіцкі духаўнік, род; **Бушыл** Рыгор, род; **Ва[...]сенскі** Генадзь, кіева-пячэрскі старац, род; **Валчанскі** Павел, слуцкі архімандрыт; **Валькевіч** (**Влакевіч**) Засіма, кіева-пячэрскі архімандрыт, род; **Валькевіч** Засіма, каіева-пячэрскі старац, род; **Валькевіч** Сільвестр, дзятлавіцкі намеснік, род; **Валянскі** Іосіф, іерадыякан, кіева-пячэрскі паслушнік, род; **Вараноўскі** Дзіянісій, дзятлавіцкі ігумен, род (двойчы); **Васілеўскі** Фёдар, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Велічковіч** Карыён, пінскі ігумен, род; **Вуяхевіч** Мялецій, кіева-пячэрскі архімандрыт, род; **Вярбіцкі** Тарасій, кірылаўскі і кіева-брацкі архімандрыт; **Галавач**, род; **Галеўскі** Ілья, іераманах, род; **Гапановіч** Павел, пан, род; **Гербат**, пан, род; **Гопта** Антон, род; **Гопта** Раман, род; **Граноўскі**, род; **Грэчка** Міхаіл, род; **Дашкевіч** Іван, пан, род; **Дзёртка** Фама, пан, род; **Дзёртка** Феадосій, грозаўскі ігумен, род; **Дзянісевіч** Іваніха Ефрасіння, род; **Долмат** Канстанцін, род; **Драздовіч** Антоній, пан, род; **Дрозд** Яўхім, род; **Дубіна** Іеранім, кіева-пячэрскі „начальнік”, род; **Дубінскі** Іван, ніжагародскі епіскап, род;

**Дубішына** Марыя, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род; **Дунаеўскі** Руф, дзятлавіцкі ігумен, род; **Ждановіч** Феадосій, ієрадыякан, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Жучыха** Малання, род; **Жылянскі** Акакій, ієрадыякан, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Завадоўскі** Мартырый, іераманах, род; **Зайчыха** Юстына, род; **Звярака** Юстын, дзятлавіцкі ігумен, род; **Ільніцкі** Мадэст, дзятлавіцкі ігумен, род; **Ісаевіч** Дарафей, дзятлавіцкі ігумен, род; **Кавалевіч** Васіль, род; **Казакевіч** Гермаген, іканапісец, кіева-пячэрскі паслушнік, род; **Казарэзак** Міхал, давыд-гарадоцкі мешчанін, род; **Казачынскі** Міхаіл, слуцкі архімандрыт; **Казлоўскі** Майсей, род; **Калкоўна** Пелагея, род; **Калок** Васіль, род; **Канапацкі** Ігнацій, род; **Канапацкі** Трафім, род; **Кандратовіч** Аўраам, род; **Караліцкі** Іасаф, іераманах, род; **Каралькевіч** Трыфан, ієрадыякан, кіева-пячэрскі паслушнік, род; **Карпаў** Якім, род; **Касцюкевіч** Сімяон, дзятлавіцкі святар, род; **Касцюковіч** Захар, род; **Кацёба** Фёдар, род; **Кашка** Васіль, род; **Кашчыч** Самуіл, пан, род; **Клідзіч** Кірыл, род; **Кляпец** Паісій, кіева-пячэрскі намеснік, род; **Коляр** Барыс Пятровіч; **Кузьмічоў** Фёдар, род; **Кулага** Васіль, род; **Курч** Феадосій, пінскі мешчанін, род; **Лаза** Васіль, род; **Лазарэвіч** Яўстрацій, дзятлавіцкі рызнічы і благачынны, род; **Лапцюх** Раман, род; **Лебядзевіч** Валерыян, іераманах, род; **Ліневіч**, род; **Лісяневіч** Філарэт, кіева-пячэрскі іканапісец, род; **Лобач** Ісахар, манах, кіева-пячэрскі паслушнік, род; **Лойка** Аляксей, тураўскі святар, род; **Любіцкі** Феадосій, пінскі ігумен, род; **Люнкевіч**, пан, род; **Лядніцкі** Лявонцій, пінскі ігумен, род; **Ляніцкі** Варлаам, пскоўскі архіепіскап, род; **Лятун** Рыгор, род; **Ляхаўчонак** Яўстрацій, ієрадыякан, кіева-пячэрскі паслушнік, род; **Мазепа** Марыя, кіева-пячэрская ігуменння, род; **Маразовіч** Дамецыян, пінскі мешчанін, род; **Маркоўскі** Іоў, манах, род; **Марціновіч** Анціпа, дзятлавіцкі паслушнік, іераманах, род; **Масловіч** Яўстафій, пан, род; **Масюра** Іван, род; **Махцей** Кіпрыян, род; **Мельнік** Грыцка, род; **Мельнік** Міхалка, род; **Міслаўскі** Самуіл, кіеўскі мітрапаліт; **Моштылеўна** Пелагея, род; **Мурашка** Агапіт, дзятлавіцкі духаўнік, род (двойчы); **Навумава** Феадосія, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род; **Непаўротава** Феадосія, род; **Пакута** Фёдар, род; **Палукошкава** Агаф'я, род; **Палхоўскі** Серапіён, магілёўскі епіскап, род; **Палякоў** Фёдар, іканапісец, род; **Панчанка** Раман, род; **Парэцкі** Дзмітрый, пан, палкоўнік грэнадзерскага палка, род; **Патрабінскі** Манасія, дзятлавіцкі ігумен, род; **Пікоўскі** Васіян, кіева-пячэрскі намеснік, род; **Пілкевіч** Васіль, дзятлавіцкі ігумен, род; **Плебановіч** Феадосій, манах, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Прытыцкі** Пафнуцій, іераманах, род; **Пухцевіч** Аўксенцій, устаўнік Пінскага манастыра; **Пятровец** Мацей, давыд-гарадоцкі мешчанін, род; **Пяшчэрны** Якаў, іерасхіманах, род; **Пяшчэрны** Яўстрацій, іераманах, род; **Робуш** Васіль, пан, род; **Савін** (**Савун**), святар, род; **Савіч** Дзмітрый, глухаўскі ігумен; **Сакульскі** Фёдар, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Самацієвіч** Кліменцій, пан, род; **Сапкоўскі** Парфеній, смаленскі епіскап, род; **Свірыдаў** Даніл, род; **Сегень** Сямён, род (род); **Семяніцкі**, род; **Семянюк** Павел, род; **Сінкевіч** Якаў, ієрадыякан, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Скаток (?)** Рыгор, род; **Снароўскі** Іасаф, дзятлавіцкі ігумен, род; **Стаднік**, род; **Стаднікаў** Міхаіл, род; **Стампкоўскі** Мацей, пан, рэгент Пінскага гродскага суда, род; **Старыцкі** Варнава, кіева-пячэрскі старац, род; **Стральбіцкі** Іона, іераманах, род; **Суманкоўна (?)**, род; **Ссукевічава** Трафімава, пані, род;

**Сусла** Павел, пінскі мешчанін, род; **Сялецкі** Якаў, пан, род; **Тарасоўскі** Генадзь, кіева-пячэрскі паслушнік, род; **Ткачык** Дзям'ян, давыд-гарадоцкі мешчанін, род (двойчы); **Ткачык** Дзямід, род; **Усовіч** Павел, дзятлавіцкі ігумен, род; **Фларынскі** Кірыл, сеўскі і бранскі епіскап, род; **Харашун** Якаў, род; **Харашэвіч** Юстыніян, іераманах, род; **Харытановіч** Пётр, род; **Харытончык** Стэфан, род; **Хмялеўскі** Васіль, іераманах, род; **Цэбраў** Рыгор, род; **Цюцюра** Рыгор, род; **Чарнавокая** Марыя Якаўлеўна, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род; **Чарнавокі** Ерафей, род; **Чарнавокі** Ісідар, род; **Чарнавокі** Мацей, род; **Чарняўскі**, род; **Чэснічак** Афанасій, пінскі мешчанін, род; **Чэснічак** Васіль, пінскі мешчанін, род; **Шамрыла** Іван, род; **Шамрыла** Лявонцій, род; **Шапіцкі** Лука, род; **Шастакова** Марыя, давыд-гарадоцкая мяшчанка, род; **Шмароўскі** Генадзь, іераманах, род; **Шмарчук** Лука, давыд-гарадоцкі мешчанін, род; **Шчарбацкі** Цімафей, кіеўскі мітрапаліт; **Шышка**, род; **Шэнь** Сава, род; **Юркевіч** Іянікій, дзятлавіцкі намеснік, род; **Юхневіч** Якім, святар, род; **Яворскі** Феактыст, дзятлавіцкі ігумен, род; **Янкоўскі** Дзмітрый, пінскі мешчанін, род; **Ярашонак** Сямён, род; **Яроўскі** Мафусаіл, манах, дзятлавіцкі паслушнік, род; **Ясінскі** Варлаам, кіеўскі мітрапаліт, род; **Яцыніч** Казімір, пан, род.

8. Геаграфічны паказальнік: **Белгарад***, г.; **Вільня**, г.; **Глухаў***, г.; **Грозава***, м.; **Давыд-Гарадок**, м.; **Дзятлавічы**, в.; **Кодань**, м.; **Кіеў**, г.; **Лунін**, м.; **Лунінец**, в.; **Магілёў***, г.; **Ніжні Ноўгарад***, г.; **Пінск***, г.; **Пскоў***, г., **Рожаўка**, в. Кіеўскага палка; **Слуцк**, г.; **Смаленск***, г., **Тураў***, м.

8. НГМРБ, кп 494 (41 аркуш).

9.



**№ 6.**

1. **Дукора**, м., уніяцкая царква Св. Пятра і Паўла.
2. Мінскі павет Мінскага ваяводства.
3. Пухавіцкі раён Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь.
4. 1755.09.07 – 1871 г.
5. Арыгінальны загаловак: „Сіæ книга, глаголемаæ Сүбо*т*никъ, належащаæ до ц(е)рков(и) Дүкорске*и* С(вя)тыхъ верховныхъ Ап(о)*с*т(о)лъ Петра и Павла, стараніемъ чрезъ мене, ѿца Стефана Σүщинскаго, през̾битера дүкорскаго, списаныи в рокү ҂а҃ѱ҃н҃е (1755) м(е)с(я)ца септемвріæ з҃ (7) днѧ в день с(вя)таго м(у)ч(е)ника Созонта".
6. Асабовы паказальнік: 6.1. Агульная частка: кіеўскія мітрапаліты, святары царквы. 6.2. **Абрамёнак (Абраменка)**, род; **Абрамчук**, род; **Агінскі**, род; **Алесяевіч**, род; **Алёшка**, род; **Андросаў** Ануш, род; **Байко**, род; **Баравік** Сільвестр, род; **Баравік**, род; **Бараноўскі**, святар, род; **Баркоўскі**, род; **Барташэвіч**, род; **Барысёнак**, род; **Бачыла**, род; **Беланович** Ян, род; **Беліковіч**, род; **Беліновіч**, святар, род; **Біральчык**, род; **Блажко**, род; **Бурак**, род; **Буцкевіч**, род; **Вага**, род; **Валенда** Ціт, род; **Валькевіч**, род; **Вараніцкі**, род; **Варона**, род; **Віннік** Матус, род; **Віннік**, род; **Вужачын** Ярмола, род; **Вужачын**, род; **Вясёлка (Вясёльчын) „Песенька"**, род; **Галубецкі**, род; **Ганчарык** Ілья, род; **Гарбацэвіч**, род; **Гарбач** Амяльян, род; **Гарбачэвіч**, род; **Генцыберус** Андрэй, род; **Гладыш**, род; **Глузд**, род; **Гляцэвіч** Дарафей, род; **Гляцэвіч**, род; **Грынь** Пракоп, род; **Грышан**, род; **Гузік**, род; **Гул**, род; **Дуброўскі** Адам, род; **Жгун**, род (двойчы); **Жданько**, род; **Жораў**, род; **Іванашка**, род; **Ісайчук**, род; **Ісайчык** Анікей, род; **Кавалевіч** Аўдзей, род; **Казлоўскі**, род; **Казырскі**, пан, род; **Калбека „Страх"**, род; **Каляда (Калядзёнак)**, род; **Каляда** Андрэй, род; **Каляда** Барыс, род; **Камлюк**, род; **Карнацкі**, род; **Карнейка**, род; **Катланін** Ісай, род; **Катовіч**, род; **Каток**, род; **Качановіч „Навасільчык"**, род; **Кеда** Андрэй, род; **Кіцель**, род; **Клімантовіч**, святар, род; **Кляеўскі**, святар, род; **Корзун** Сілка, род; **Крайко (Крайчын)**, род; **Крук**, род (двойчы); **Крупскі**, род; **Кудзіновіч**, род; **Кулеша**, род; **Куніцкі**, род; **Кунька**, род (двойчы); **Курневіч**, род (двойчы); **Кутузік**, род; **Лабус**, род (двойчы); **Лапата**, род; **Лапатка „Каза"** Самсон, род; **Лапатка** Аніська, род; **Лапеніца** Ілья, род; **Лукашонак**, род; **Лысак** Сяргей, род; **Людчык**, род; **Лявіцкі**, род; **Лявонаў**, род; **Ляпешка** Хведар, род; **Ляпешка**, старац, род; **Мазоўка „Батура"**, род; **Мазоўка „Шашаль"** Клім, род; **Мазоўка „Яўсеяўчык"**, род; **Мазоўка** Ананія, род; **Мазоўка** Майсей, род; **Мазоўка** Пахом, род; **Мазоўка** Піліп, род; **Мазоўка** Стэфан, род; **Мазоўка**, род; **Мануйла**, род; **Маркевіч „Шчэрба"**, род; **Маркевіч**, род; **Мацкевіч**, род; **Мацяш (Мацяшын)**, род; **Мельнік „Дзіравы"**, род; **Мельнік „Шкарапа"**, род; **Мікуліч**, святар, род; **Мікульчык**, род; **Міцюша**, род; **Мялечка**, род; **Набойчык**, род; **Ніканчык**, род; **Оштарп**, род; **Палуян „Свістун"**, род; **Пальчэўскі**, святар, род; **Пастух**, род; **Пікулік**, род; **Пілієўскі** Марк, святар, род; **Пісар**, род; **Піскун** Сілка, род; **Піскун** Хведар, род; **Піскун**, род (двойчы); **Пляскач**, род; **Прахарчук**, род; **Птушка (Птушчын)**, род; **Пякарскі**, святар, род; **Рабчонак** Савасцей,

